ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Аляксандр Рыбак: "Мне дастаткова і Еўропы"**



**"Кіберпаляванне" ў сеціве**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Галіна ФІЛІПОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:**

***«На сустрэчах з выбаршчыкамі даволі часта ўздымаюцца пытанні па праблеме ўтрыманцаў. Гэта гучыць як боль сем'яў, суседзяў і нават асобных населеных пунктаў. На жаль, мы павінны прызнаць, што ў нас з'явілася катэгорыя грамадзян працаздольнага ўзросту, якія не здольны самастойна вырашыць пытанні свайго матэрыяльнага забеспячэння. У выніку атрымліваецца так, што гэтыя грамадзяне могуць разлічваць толькі на дзяржпадтрымку. Таму дзяржава і вымушана неяк стымуляваць іх да працы. Адным з першых крокаў ужо сталі змены, звязаныя з пенсійным забеспячэннем. Цяпер можна прыняць і рашэнні па больш справядлівым размеркаванні розных матэрыяльных выгод. Што тычыцца нейкіх магчымых санкцый (адміністрацыйных ці нават крымінальных) адносна дармаедства, то гэта можа быць толькі крайняй мерай».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10680,00 | ■ |
| Еўра | 13580,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 260,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 821,54 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

14202>
9 771990 763008

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. ЧАЦВЕР № 202 (27812) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ВАЙСКОВЫЯ СТРОІ АД «МОНЫ»

*Швачкі, што працуюць на полацкім ААТ «Мона», без працы не бываюць. Уявіце сабе — за месяц шыюць ні многа ні мала 20 тысяч форменных сарочак. Гэтае строгае адзенне ідзе на патрэбы расійскіх сілавых структур. Патрэба ў прадукцыі полацкіх швачак вялікая — прыкладна мільён штук на год. Гэты праект пачалі рэалізоўваць у жніўні, а ўжо ў кастрычніку выйшлі на запланаваныя магутнасці. Каб справіцца з вялікім аб'ёмам заказу, прадпрыемства набыло спецыяльнае швейнае абсталяванне. Але чалавечы фактар у гэтай штучнай рабоце па-ранейшаму самы важны, таму на кожным участку патрабуецца ўважлівасць і адказнасць. Гэта добра разумеюць усе супрацоўнікі прадпрыемства, у тым ліку майстар брыгады Святлана ЛЕЙСПУК і ўпакоўшчыца Вольга АСІНСКАЯ.*



Фота БЕЛТА.

■ Сацыяльны вектар

## ПЕНСІЯ БЕЗ МЕЖАЎ

**Спецыялісты Мінпрацы і сацабароны адказалі на пытанні аб пенсіях пры змене месца жыхарства**

**21 кастрычніка на сайце Мінпрацы і сацыяльнай абароны прайшла анлайн-канферэнцыя на тэму «Пенсійнае забеспячэнне на падставе міжнародных дагавораў (пагадненняў)». Самыя цікавыя для нашых чытачоў вытрымкі з віртуальнага дыялогу мы прапануем вашай увазе.**

***— З'яўляюся грамадзянінам Рэспублікі Беларусь. У 2000 годзе паехаў на заробкі ў Расію, дзе працую да гэтага часу. Ці змагу я атрымліваць расійскую пенсію?***

— Згодна з Дагаворам з Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння ад 24 студзеня 2006 года грамадзяне Беларусі і грамадзяне РФ маюць права выбраць адзін з двух варыянтаў:

1) пенсію ад Рэспублікі Беларусь і ад Расійскай Федэрацыі. У гэтым выпадку кожная дзяржава ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам прызначыць і будзе выплачваць пенсію за час працы на сваёй тэрыторыі пасля 12 сакавіка 1992 года. Стаж да 13 сакавіка 1992 будзе ўлічаны дзяржавай, дзе пражывае пенсіянер.

СТАР. 3

■ КІНО Д'АР

Валерый ТАДАРОЎСКІ:

## «КІНО — САМЫ ДАРАГІ ВІД САМАВЫЯЎЛЕННЯ»

**Кінафестываль «Лістапад» назваў імя старшыні журы асноўнага конкурсу — ім стане расійскі рэжысёр, прадзюсар, паслядоўнік заходніх кінатрадыцый Валерый Тадароўскі. Яго фільмаграфія мільгае гучнымі назвамі і вядомымі імёнамі. Варта ўзгадаць карціны «Палюбоўнік» з Алегам Янкоўскім, «Мой брат Франкенштэйн» пра феномен пакалечанай на вайне душы ці яркі мюзікл «Стылягі». Многія акцёры пачыналі сваю зорную кар'еру з карцін Валерыя Тадароўскага. Яўген Міронаў, Інгеборга Дапкунайтэ, Чулпан Хаматава адкрыліся гледачу ў фільмах «Каханне», «Падмаскоўныя вечары», «Краіна глухіх», а самі карціны зрабілі рэжысёра знакавай персонай рускага кіно. Карэспандэнту газеты «Звязда» кінематаграфіст распавёў аб творчым складніку прадзюсарскай працы, увасабленні рускай душы ў кіно і залежнасці рэжысёра як творцы.**



***— У працы прадзюсара ёсць нейкі творчы складнік?***

— Творчасць у тым, што прадзюсар з нічога стварае фільм. Што значыць стварае: я знаходжу ідэю (магу яе прыдумаць, знайсці ў прачытанай кнізе, выпадкова пачуць нейкую гісторыю), запрашаю сцэнарыста — а знайсці правільнага сцэнарыста няпроста, — потым, калі сцэнарый атрымліваецца, я шукаю рэжысёра — а добрых рэжысёраў не так шмат. Трэба знайсці рэжысёра, які ідэальна падыдзе для канкрэтнага сцэнарыя. Разам са сцэнарыстам і рэжысёрам ты абмяркоўваеш фільм, спрабуючы прыдумаць, які ён, для каго ён, пра што ён. Здымаецца фільм і калі — цьфу, цьфу, цьфу — усё атрымліваецца, прадзюсар павінен даць гэтаму фільму жыццё. Усё гэта — творчасць, асновы менавіта прадзюсарскай прафесіі.

СТАР. 4

# УРОКІ ПАМЯЦІ

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў наведалі Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

**Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны дапамагае тым, хто не бачыў вайны, — маладому пакаленню — зразумець тую страшную небяспеку, якую нясе фашызм усяму чалавецтву. На гэта звярнуў асаблівую ўвагу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў беларускага парламента падчас наведвання гэтай установы разам з дэпутатамі.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Для дэпутатаў была арганізавана экскурсія, падчас якой яны пазнаёміліся з экспазіцыямі, прысвечанымі храналогіі ваенных дзеянняў, гісторыі партызанскага і падпольнага руху, умовам, у якіх выжывалі вязні турмаў і канцэнтрацыйных лагераў. Кіраўнік ніжняй палаты парламента падзякаваў супрацоўнікам музея, якія, аберагаючы гісторыю, выконваюць высокую місію — выхоўваюць годных грамадзян Беларусі.

— Мы бачым, як у апошні час імкліва пашыраецца пояс нестабільнасці, — заўважыў па выніках знаёмства з экспазіцыяй Уладзімір Андрэйчанка. — Ваенныя канфлікты ўсё больш набліжаюцца да нашых межаў. Таму мы, дэпутаты, павінны як у заканадаўчым, так і ў міжнародным плане рабіць усё для таго, каб на зямлі быў мір, каб наша краіна была эканамічна развітай, каб армія была моцнай, каб нас паважалі на міжнароднай арэне, а галоўнае — неабходна ўмацоўваць адзінства народа.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што ролю музея ВАВ тут немагчыма пераацаніць: яго экспанаты, ды і ўся атмасфера, з'яўляюцца яркім сведчаннем таго, што з'яднаны народ ніхто не зможа перамагчы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# zviazda.by WEB-водгук

**Самыя цікавыя і надзённыя каментары на нашым сайце**

**На пачатку тыдня кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях занятасці і міграцыі ў Беларусі. На ёй чарговы раз прагучала даволі злабадзённая для грамадства тэма: як прымусіць працаваць і плаціць падаткі ў бюджэт тых людзей, якія ў эканоміцы не задзейнічаны, аднак пры гэтым не адмаўляюцца ад дзяржаўных даброт? Асобна Аляксандр Лукашэнка закрануў і тэму працаўладкавання гэтак званых «абавязаных асоб»...**

Усё гэта знайшло працяг на шматлікіх інтэрнэт-пляцоўках. Не стаў выключэннем і сайт «Звязды». Вось якія прапановы агучылі нашы чытачы:

**@Валер**

Лічу, што праблему атрымання медыцынскай дапамогі тымі, хто не плаціць падаткі ў беларускі бюджэт, вырашыць вельмі проста. У кожнага чалавека зараз ёсць картка сацыяльнага страхавання. Трэба абавязаць людзей насіць яе кожны раз у паліклініку і правяраць перад выдачай амбулаторнай карты. І калі высветліцца, што чалавек пэўны перыяд (скажам, год ці паўтара) нідзе на тэрыторыі Беларусі не працуе і падаткаў, адпаведна, не плаціць, значыць, дапамогу яму можна аказаць толькі экстранную, калі стаіць пытанне жыцця і смерці. Выключэнне трэба зрабіць для дзяцей, студэнтаў і пенсіянераў — тых, хто працаваць не можа. Так, на мой погляд, будзе больш справядліва.

**@Люцік**

Трэба не толькі браць, але і аддаваць — такі закон жыцця. Ёсць рацыя ў тым, што ўсе роўныя, таму кожны павінен плаціць падаткі і прыносіць карысць грамадству.

**@Ася**

Так званыя «абавязаныя асобы» былі працаўладкаваны дворнікамі ў маім ЖЭСе. Ды вось толькі бачыкаў іх працы відаць не было. Сяк-так спрабавалі штосьці рабіць... Добра яшчэ, што мінулая зіма не выдалася асабліва снежнай. А так пад'езд ніхто не мыў вышэй за другі паверх, вокны сталі брудныя, са смеццеправода ў трыццаціградусную спякоту даносіўся смурод. Як толькі «абавязаныя асобы» зніклі, адразу ж у пад'ездзе навялі парадак.

Таму пытанне — ці трэба іх накіроўваць дворнікамі ў ЖЭСы?

**@Іван**

Я лічу, што дармаеды павінны плаціць асаблівы падатак, пакуль не ўладкуюцца нарэшце на працу! Праўда, я не думаю, што такі падатак варта браць з тых, хто вымушана беспрацоўны (па стане здароўя або сямейным становішчы). Тут трэба ў прыватным парадку падыходзіць і вызначаць удар, а не лупіць па ўсіх...

***ZVIAZDA.BY. Заходзьце, чытайце, каментуйце! Ваша думка важная!***

■ Парламенцкі дзённік

# ВАДА ГАРЭЛЦЫ НЕ «СЯБАР»

## ДЭПУТАТЫ ПАГАДЗІЛІСЯ З ЗАБАРОНАЙ «СКРЫТАЙ» ПРАПАГАНДЫ АЛКАГОЛЮ І ТЫТУНЮ

**Сярод 11 законапраектаў, разгледжаных учора ніжняй палатай беларускага парламента, адзін датычыўся забароны рэкламы пітной вады і іншых «нявінных» рэчаў, калі пры гэтым выкарыстоўваецца брэнд, які выпускае алкагольную альбо тытунёвую прадукцыю, а таксама, калі выкарыстоўваецца знешні выгляд тары альбо ўпакоўкі, падобных на тыя, у якіх змешчаны алкагольныя напоі ці цыгарэты.**

**Міністр гандлю Валянцін ЧАКАНАЎ** для нагляднасці паклаў на трыбуну перад дэпутатамі пачак мыла і пачак цыгарэт, упакоўка якіх выглядала амаль аднолькава, і прамовіў: «Безумоўна, на наш погляд, гэта недапушчальна».

— Закон аб рэкламе жорстка абмяжоўвае рэкламу алкагольных і тытунёвых вырабаў, — патлумачыў міністр. — Разам з тым закон дае магчымасць размяшчаць алкагольныя і тытунёвыя брэнды ў рэкламе іншых тавараў і паслуг. Гэта спраўкакавала практыку вытворчасці розных тавараў, работ і паслуг (газіраваных напояў, забаўляльных паслуг і іншае) пад брэндамі алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў, а таксама ў аналагічнай спажывецкай упакоўцы. У большасці выпадкаў гэта накіравана ў абход заканадаўчых абмежаванняў, уводзіць у зман пакупнікоў і з'яўляецца прыхаванай прапагандай алкаголю.

Для спынення падобнай практыкі Саветам Міністраў быў пададзены ў парламент праект закона «Аб унясенні змен у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе». Дакумент прапануе вызначыць для рэкламы, падобнай на рэкламу алкагольных і табачных вырабаў, гэткі ж самы абмежавальны рэжым, што існуе для рэкламы названай прадукцыі. Міністр гандлю нагадаў, што рэклама тытунёвых вырабаў у Беларусі цалкам забаронена. Рэклама алкагольных напояў забаронена на тэлебачанні, радыё, у вулічнай рэкламе, на прыпынках грамадскага транспарту, станцыях метрапалітэна, у транспартных сродках, на першых і апошніх старонках СМІ, таварах спартыўнага прызначэння, цацках, ва ўстановах адукацыі, аховы здароўя, культуры, фізічнай культуры, спорту, у аэрапортах і на вакзалах. У астатніх месцах рэклама алкагольных напояў дазволена, але не павінна змяшчаць заклікі да іх ужывання, выявы людзей, жывёл, спажывецкай тары, апісанне ўласцівасцяў і цэн алкагольных напояў.

Пад «падобнай» законапраект мае на ўвазе рэкламу, якая змяшчае найменне тавару, работы ці паслугі, назву арганізацыі, імя грамадзяніна, гандлёвы знак, знак абслугоўвання, геаграфічнае указанне; выяву, падобную да спажывецкай тары, падобныя з найменнем, таварным знакам выявы тары алкагольнага напою альбо тытунёвага вырабу.

Пры гэтым законапраект прапануе не распаўсюджваць абмежаванні на рэкламу арганізацый альбо грамадзяніна, размешчаную на вулічных шыльдах і паказальніках, а таксама на інтэрв'ю пра дзейнасць арганізацыі і на сацыяльную рэкламу, дзе ў прафілактычных мэтах выкарыстоўваецца выява тары, якая нагадвае алкагольную ці тытунёвую спажывецкую тару.

Праект закону прапануе захаваць існуючы парадак рэкламавання тавараў, работ і паслуг пад брэндамі, якія не маюць дачынення да алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў, але якія таксама абмежаваны ў рэкламаванні. Маюцца на ўвазе брэнды казіно, зброі і іншыя. Аб'екты грамадскага харчавання, цацкі і падобнае могуць рэкламавацца пад такімі брэндамі пры ўмове называння аб'екта рэкламавання, напрыклад: «Дзіцячая цацка «Танк Т-34».

Дэпутаты разгледзелі законапраект у першым чытанні.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

# НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ВЫБРАНЫ НОВЫ СТАРШЫНЯ ФЕДЭРАЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ

**Новым старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі стаў Міхаіл Орда. Адпаведнае рашэнне прынялі члены савета ФПБ на пасяджэнні ў Мінску.**

Міхаіл Орда адзначыў, што Саветы дэпутатаў, маладзёжныя арганізацыі з'яўляюцца апорай для нашай дзяржавы і грамадства. Галоўнай задачай для прафсаюзаў заўсёды была і застаецца абарона інтарэсаў працаўніка — менавіта таго чалавека, які стварае ўсе багацці Беларусі. На чале ФПБ Міхаіл Орда паабяцаў выкарыстоўваць для гэтага ўсе магчымасці, якія ёсць у прафсаюза, і цесна працаваць з урадам.

Новы старшыня Федэрацыі прафсаюзаў адзначыў, што для выканання пастаўленых задач ёсць усё неабходнае. Гэта добра падрыхтаваныя кадры, а таксама ўжо распрацаванае генеральнае пагадненне з урадам, дзе вызначаны ўсе моманты супрацоўніцтва. У планах у Міхаіла Орды сустрэча з галіновымі прафсаюзамі, абмеркаванне з імі надзённых пытанняў. Асобная ўвага будзе надавацца працы з моладдзю.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

## І ПАМЕРЛІ Ў АДЗІН ДЗЕНЬ?..

**У кватэры жылога дома ў Лідзе знойдзены целы пажылых сужэнцаў. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Лідскім РАУС.**

Па званку суседзяў, якія былі занепакоены тым, што пенсіянераў некалькі дзён не было відаць, праваахоўнікі праверылі жыллё. Муж і жонка былі знойдзены мёртвымі, па папярэдняй інфармацыі, без прыкмет гвалтоўнай смерці.

Як патлумачылі ў РАУС, дзверы кватэры былі замкнёны знутры. Цяпер на месцы працуюць спецыялісты, высвятляюцца абставіны і прычыны смерці. Праваахоўнікі пакуль не бачаць у здарэнні крымінальнага падтэксту, хутчэй за ўсё, сужэнцы памерлі або ў адзін дзень, або адзін за адным.

Абаім было больш за 70 гадоў.

## БАТЭ Б'Е АНТЫРЭКОРДЫ

**Чэмпіёны Беларусі пацярпелі чарговае разгромнае паражэнне ў сёлетнім розыгрышы Лігі чэмпіёнаў.**

Гэтым разам барысаўчан на сваім полі экзаменавалі данецкі «Шахцёр». Першыя дзесяць хвілін падапечныя Аляксандра Ермаковіча яшчэ трымаліся, але пасля ў вароты Сяргея Чэрніка пасыпаліся мячы. Усяго ў гэтай сустрэчы ўкраінцы адзначыліся 7 разоў, чым дапамаглі БАТЭ стварыць свой новы антырэкорд. Яшчэ нікому беларускія чэмпіёны ў еўракубках з падобнай розніцай не ўступалі.

— Мы самі вінаватыя ў паражэнні, — прызнаўся пасля гульні **Аляксандр ЕРМАКОВІЧ, галоўны трэнер БАТЭ.** — Зрабілі шмат памылак. Так, нас прымусілі памыляцца, аднак на такім узроўні рабіць гэта недазвальна. Нам не хапае стабільнасці. Напэўна, прычына ў нас саміх.

**Група Н.** 21 кастрычніка. БАТЭ — «Шахцёр» (Украіна) — 0:7 (Алекс Тэйшэйра, 11, Луіс Адрыяна, 28, 36, 40, 44, 82, Коста, 35), «Порту» (Партугалія) — «Атлетык» (Іспанія) — 2:1 (Эрэра, 45, Куарэжма, 75; Фернандэс, 58).

**Турнірны расклад:** «Порту» — 7, «Шахцёр» — 5, БАТЭ — 3, «Атлетык» — 1.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# ЗАДАЧА НА СЁННЯ — ПРАФІЛАКТЫКА ПАРУШЭННЯЎ

## Супрацьстаянне карупцыі дае плён, аднак да выкаранення хабарніцтва яшчэ далёка

**У Генеральнай пракуратуры прайшло пасяджэнне рэспубліканскай каардынацыйнай нарады па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй. Падчас мерапрыемства абмяркоўваўся шэраг пытанняў, галоўным сярод якіх была прафілактыка карупцыі.**

Нягледзячы на тое, што ў перыяд з 2010 па 2013 год колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў знізілася на 10%, агульны стан барацьбы з хабарамі пакідае жадаць лепшага. Самыя праблемныя сферы, у якіх сёлета зафіксавана найбольшая колькасць карупцыйных злачынстваў: дзяржаўнае кіраванне, ахова здароўя, прамысловасць, будаўніцтва, адукацыя.

Сярод галоўных перашкод антыкарупцыйнай дзейнасці называліся фармалізм, з якім да барацьбы з хабарніцтвам падыходзяць мясцовыя ўлады; неэфектыўная праца камісій па супрацьдзеянні карупцыі, кіраўнікі і члены якіх часта не валодаюць неабходнымі ведамі і не маюць пэўных паўнамоцтваў для такой працы, і іншыя.

— Галоўная праблема заключаецца ў тым, што антыкарупцыйныя органы звычайна працуюць па факце злачынства. Задача на сёння — прафілактыка парушэнняў у гэтай сферы. Таксама важна вызначыцца, ці патрэбны нам антыкарупцыйныя камісіі, калі іх праца не прыносіць плёну, — адзначыў **генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК.**

Па словах кіраўніка ведамства, прававых інструментаў для эфектыўнай барацьбы з хабарніцтвам у краіне хапае. Выкрывальнасць злачынстваў знаходзіцца на высокім узроўні, але іх папярэджанне не задавальняе Генпракуратуру.

Вынікам нарады стаў шэраг даручэнняў. Так, органам дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамам, Мінгарвыканкаму трэба правесці аналіз расходавання бюджэтных сродкаў, вызначыць карупцыйныя рызыкі ў кожным адгалінаванні дзейнасці і распрацаваць планы па іх мінімізацыі і выкараненні. Павінны быць створаны комплексныя праграмы па прафілактыцы злачынстваў на наступны год, у якія ўвойдуць канкрэтныя мерапрыемствы па папярэджанні карупцыйных правапарушэнняў.

Акрамя гэтага, Міністэрству адукацыі сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце прапанавана распрацаваць і ўкараніць у ВНУ навучальны цыкл «Супрацьдзеянне карупцыі» для студэнтаў, якія вучацца на спецыяльнасцях, звязаных з дзяржаўным кіраваннем, эканомікай і юрыспрудэнцыяй.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

# ПЕНСІЯ БЕЗ МЕЖАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

2) пенсію толькі ад дзяржавы, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца. Асаблівасць другога варыянту ў тым, што гэты выбар з'яўляецца канчатковым. Перагляд выбару можа быць ажыццёўлены ў выпадку змены асобай грамадзянства.

Такім чынам, расійская пенсія вам можа быць прызначана за перыяд работы на тэрыторыі Расіі з выплатай узносаў яе ў пенсійны фонд.

***— Куды трэба звяртацца і якія паперы падаць, каб перавесці пенсію з Расіі ў Беларусь?***

— Расійскія пенсіі выплачваюцца ў Беларусі асобам, якія пастаянна пражываюць на яе тэрыторыі. Па пытанні пераводу расійскай пенсіі ў Беларусь неабходна звяртацца з заявай, дакументам, які сведчыць асобу і пастаяннае пражыванне на тэрыторыі Беларусі, і працоўнай кніжкай у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства ў Беларусі.

***— Усё жыццё працаваў у Казахстане. З мінулага года атрымліваю там пенсію. Планую пераехаць на пастаяннае жыхарства ў Беларусь. Якую пенсію я буду атрымліваць?***

— У выпадку пераезду з Рэспублікі Казахстан на пастаяннае жыхарства ў Рэспубліку Беларусь ваша пенсіянаванне будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні».

Згодна з названым законам памер працоўнай пенсіі залежыць ад працаглацсі стажу працы і велічыні заробку. У стаж залічваецца час працы на тэрыторыі СССР да 1 студзеня 1992 года. Перыяды працы на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан, што праходзілі з 1 студзеня 1992-га па 1 студзеня 1998 года, залічваюцца ў стаж пры ўмове выплаты ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае (пенсійнае) страхаванне. Перыяды працы ў Казахстане пасля 1 студзеня 1998 года ў стаж пры прызначэнні пенсіі ў Рэспубліцы Беларусь не залічваюцца.

Пры прызначэнні пенсіі ў 2014 годзе заробак вызначаецца за любыя 20 гадоў запар з апошніх 30 гадоў працы і іншай дзейнасці, што залічваецца ў стаж. Штогод гэтыя перыяды павялічваюцца на 1 год. Пры гэтым заробтная плата за працу за межамі Беларусі пасля 1 студзеня 1992 года не ўлічваецца.

З улікам заканадаўства, якое дзейнічае цяпер, рэкамендуем вам да пераезду ў Беларусь запатрабаваць даведкі аб заробку за перыяды вашай працы да 1 студзеня 1992 года і даведкі аб працы з выплатай узносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне да 1 студзеня 1998 года.

***— Праз месяц мне спаўняецца 60 гадоў. Хто будзе аплачваць мне пенсію за стаж працы ў Латвіі з 1980 па 2010 год?***

— Паміж Рэспублікай Беларусь і Латвійскай Рэспублікай 29 лютага 2008 года заключаны Дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння. З улікам палажэнняў гэтага дагавора пытанне аб прызначэнні вам пенсіі за перыяды вашай працы на тэрыторыі Латвіі, у тым ліку да распаду СССР, будзе разглядацца Латвійскай Рэспублікай у адпаведнасці з яе нацыянальным заканадаўствам.

***— Я грамадзянін Літвы, пражываю ў Беларусі. У 2012 годзе мне была прызначана беларуская пенсія, у тым ліку за працу ў Літве ў перыяд з 1975 па 1987 год. Планую вярнуцца на жыхарства ў Літву. Ці будзе мне Літва плаціць пенсію за названы стаж працы ў СССР?***

— Артыкулам 5 Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай аб сацыяльным забеспячэнні ад 4 лютага 1999 года прадугледжаны экспарт пенсій. Перагляд пенсій па нормах названага дагавора ў выпадку перасялення пенсіянера з тэрыторыі адной дзяржавы на тэрыторыю другой не робіцца. Таму ў выпадку вашага перасялення на пастаяннае жыхарства ў Літву вам будзе выплачвацца беларуская пенсія праз Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацабароны Беларусі.

***— Адпрацавала ў Беларусі 17 гадоў. Цяпер пастаянна пражываю ў Германіі. Ці можа мне быць прызначана пенсія Рэспублікай Беларусь за перыяды маёй працы?***

— Пенсійнае забеспячэнне грамадзян у Беларусі ажыццяўляецца пры ўмове пастаяннага пражывання на яе тэрыторыі. Іншыя правілы (у тым ліку тыя, што прадугледжваюць экспарт пенсій) могуць быць вызначаны ў міжнародным дагаворы. З Германіяй дагавор у галіне пенсійнага забеспячэння адсутнічае. Такім чынам, падстаў для прызначэння вам пенсіі ў Беларусі няма.

***— Ці будзе налічвацца пенсія ў Беларусі за гады працы ва Украіне?***

— Згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, пры вылічэнні пенсіі ўлічваецца час працы ва Украіне за перыяды да 1 ліпеня 1998 года. Пры гэтым за перыяд з 1 студзеня 1992 года па 1 ліпеня 1998 года — пры ўмове выплаты страхавых узносаў у пенсійны фонд Украіны. Перыяды працы на тэрыторыі Украіны пасля 1 ліпеня 1998 года пры вылічэнні пенсіі ў Рэспубліцы Беларусь не ўлічваюцца.

***— Грамадзянін Беларусі працуе ў расійскай кампаніі з 01.01.2012 года па цяперашні час. Працадаўца выплачвае за яго страхавыя ўнёскі ў пенсійны фонд Расіі. Ці будзе залічаны гэты перыяд працы ў працоўны стаж пры афармленні пенсіі па ўзросце ў Рэспубліцы Беларусь?***

— За перыяды работы з выплатай страхавых узносаў у пенсійны фонд Расіі пенсію будзе прызначаць і выплачваць Расійская Федэрацыя.

***— Як выплачваецца пенсія беларускаму пенсіянеру пры пераездзе на пастаяннае месца жыхарства ў Расійскую Федэрацыю? Пенсія прызначана за перыяд работы з верасня 1975 па красавік 2013 года.***

— Калі ўся праца працякала толькі ў Беларусі, то ў Расійскай Федэрацыі экспартуецца пенсія за ўвесь стаж альбо пенсія за стаж з 13 сакавіка 1992 года. У другім варыянце пенсію за стаж да 13 сакавіка 1992 годзе будзе выплачваць Расійская Федэрацыя.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

■ Зямное і духоўнае

# ГЕРОЙ ВЕРЫ

**З нагоды 100-гадовага юбілею кардынала Казіміра Свёнтка ў сталічным архікафедральным касцёле Найсвяцейшай Панны Марыі адбылося набажэнства, якое ўзначаліў архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.**



Падчас набажэнства.

Салдатаў і афіцэраў, якія вылучыліся мужнасцю і самаахвярнасцю на вайне, здавён прынята называць героямі. Кардынал Казімір Свёнтак таксама стаў героем для некалькіх пакаленняў беларускіх католікаў. Да развалу Саюза яму ўвесь час прыходзілася адстойваць сваю веру ў барацьбе з атэізмам. Шчырая малітва замяняла яму зброю. Ён не баяўся заставацца святаром у самыя небяспечныя моманты жыцця. Маліўся, святкаваў Каляды, хрысціў людзей нават у ссылцы на лагерным Усходзе, дзе падобная «правіна» магла каштаваць жыцця…

— Характэрным быў аптымізм кардынала Свёнтка і яго бязмежны давер Богу,— адзначыў **архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.** — Калі прыйшоў час завяршэння ссылкі і начальнік лагера спытаў у яго, як магло так стацца, што чалавек з такім складаным лёсам застаўся жывы, Свёнтак адказаў, што так хацеў Бог.

Сярод тых, хто прыйшоў на імшу, шмат не толькі моладзі, але і людзей сталага веку. А яны, упэўнены, добра памятаюць, як Казімір Свёнтак дапамагаў аднаўляць Мінскі кафедральны касцёл. Ён хоць і пражыў больш за паўстагоддзя ў Пінску, у невялічкім дамку па вуліцы Шаўчэнкі, але спрычыніўся да адбудовы храмаў па ўсёй краіне, калі ў 1991 годзе быў прызначаны архіепіскапам Мінска-Магілёўскім, а праз тры гады — кардыналам. У вечнасць Казімір Свёнтак адышоў на 97-м годзе жыцця.

— Памятаю, як кардынал распавядаў мне пра палярнае ззянне,— узгадвае Тадэвуш Кандрусевіч.— Калі яно з'яўляецца, чутно лёгкае патрэскванне. Людзі кажуць, што гэта свята, якое гаворыць. Але ён ведаў, што ўначы ёсць яшчэ іншае ззянне — ззянне свята Хрыста, якое можа перамагчы пераследаванне веры.

**Леанід ГУЛЯКА, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў,** пасля імшы падкрэсліў, што кардынал Казімір Свёнтак — асоба, якая для Беларусі, для Касцёла зрабіла вельмі шмат.

— Гісторыя каталіцкай царквы на Беларусі цесна звязана з імем кардынала, які праз уласны вопыт, высокія маральныя каштоўнасці ўсё жыццё імкнуўся да зацвярджэння хрысціянскіх ідэалаў. Ён, несумненна, з'яўляецца адным з самых значных рэлігійных дзеячаў Беларусі.

— Памятаю ксяндза-кардынала з дзяцінства, калі яшчэ не хадзіў у касцёл,— узгадвае Сяргей, малады вернік.— Ён выступаў у розных перадачах, і для нас было традыцыйнай паслухаць яго словы ў велікодную раніцу. Цяпер я добра ўсведамляю, што ў той час Касцёл у Беларусі толькі пачынаў адраджацца, і кардынал Казімір Свёнтак адыгрываў у гэтым адну з найважнейшых роляў.

Варта адзначыць, што пра юбілей не забылася «Белпошта», якая выпусціла ў абарачэнне картку з арыгінальнай маркай — выявай кардынала Казіміра Свёнтка (мастак — Уладзімір Васюк). Наклад карткі складае 30 тысяч асобнікаў.

**Тарас ШЧЫРЫ** ■

Фота Надзеі БУЖАН.




Паштовая картка з выявай кардынала Казіміра Свёнтка.

■ Тэхналогіі для эканомікі

# Бюстгальтары на складах залежвацца не будуць

## Як вытворца жаночай бялізны мяняе бізнес-стратэгію

**У сумесным прадпрыемстве «Мілавіца» сур'ёзна задумаліся, як павысіць узровень продажаў пры дапамозе новых IT-сістэм. Наступны крок развіцця прадпрыемства — укараненне праграмнага забеспячэння, якое дазволіць палепшыць працэсы кіравання вытворчасцю, забяспечыць сувязь паміж усімі структурамі прадпрыемства і аператыўнае папаўненне асартыменту магазінаў. Толькі ў 2015 годзе на развіццё «разумных тэхналогій» плануецца накіраваць больш за 900 тысяч еўра.**

### МАШТАБНАЯ АПТЫМІЗАЦЫЯ

Сітуацыя на рынку пастаянна мяняецца. Уменне менеджменту прадпрыемства рэагаваць на гэта і ёсць тая самая аснова і галоўны паказчык эфектыўнасці вядзення бізнесу. Гэтаму спрыяе і прымяненне інавацыйных тэхналогій. Сёння хуткасць дастаўкі таксама не задавальняе кліента. З дапамогай інфармацыйных тэхналогій «Мілавіца» хоча змяніць пункт дастаўкі ў бок розніцы, а таксама канчатковага спажыўца.

«Як будзе выглядаць той лагістычны ланцужок, які мы пачынаем рэалізоўваць цяпер? У лагістычны цэнтр пастаўляецца прадукцыя са швейных цэхаў, і гэты цэнтр дазваляе рабіць пастаўкі на цэнтр размеркавання рытэйлера, які проста давозіць усю прадукцыю да крамы. Таксама мы плануем займацца дастаўкай прадукцыі да канчатковага спажыўца, які робіць свае заказы анлайн. «Мілавіца» робіць вялікую стаўку на адварotную аператыўную сувязь з рознічных пунктаў аб продажах і заказах»,— адзначыў **Сяргей ВОЙНІЧ, кіраўнік службы інфармацыйных тэхналогій СП ЗАТ «Мілавіца».**

Што тычыцца праграмнага забеспячэння, якое дазваляе кампаніі ісці ў нагу з часам, то прадпрыемства робіць стаўку на сістэму ERP. Яна забяспечвае аўтаматызацыю бізнес-працэсаў у частцы кіравання дадзенай інфармацыяй. Таксама распрацавана сістэма аналітыкі, якая спрашчае прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў у кампаніі, і сістэма кіравання складам (WMS). Дзякуючы гэтаму сціскаецца вытворчы цыкл, а таксама ёсць верагоднасць пазбегнуць многіх страт, якія ўзнікаюць пры адсутнасці дэталёвага планавання на розных этапах. З дапамогай ERP-сістэмы павышаецца рытмічнасць многіх працэсаў, зніжаюцца стаўкі, паляпшаецца прагназаванне, і гэта таксама прыцягвае кліентаў, бо ўзровень абслугоўвання становіцца лепшым.

### КУПІНЫ НА ШЛЯХУ ДА ПАКУПНІКА

Нягледзячы на такі інавацыйны падыход у арганізацыі свайго бізнесу, «Мілавіца» церпіць шэраг цяжкасцяў пры дастаўцы сваёй прадукцыі да спажыўца. Гэта тычыцца, у першую чаргу, дакументаабароту.

«Калі параўноўваць дакументаабарот у Беларусі з бліжэйшымі рынкамі Прыбалтыкі і Польшчы, то ў нас сітуацыя складанейшая. Напрыклад, для рэалізацыі трэба 10 першасных дакументаў: на прыход, на размяшчэнне і адгрузку кліенту. А за мяжой — толькі 4. У таварна-транспартнай накладной Беларусі неабходна запоўніць 42 абавязковыя палі, а там гэта дэкларуецца на ўзроўні дагавора. Чым прасцейшая сістэма, тым прасцей яе аўтаматызаваць»,— растлумачыў сітуацыю Сяргей Войніч.

### СТАБІЛЬНАСЦЬ НА ФОНЕ СТРАТ

Разам з тым ніхто не можа быць застрахаваны ад рызык на сто працэнтаў. **Генеральны дырэктар СП ЗАТ «Мілавіца» Нормундс АЗАЛІНШ** адзначыў, што ў красавіку — маі 2014 года назіралася негатыўная дынаміка ў продажах.

«Мы спрабуем сканцэнтраваць аб'ёмы вытворчасці і продажаў такім чынам, каб не дапускаць лішняга росту ўзроўню складскіх запасаў. Спецыфіка нашага бізнесу такая, што мы загадзя збіраем усе заказы. У нас ужо цяпер ёсць заказы на першыя тры кварталы 2015 года. Пад іх мы закупляем сыравіну і шыем прадукцыю. Паколькі адбылася дэвальвацыя нацыянальных валют Расіі, Украіны, Казахстана, то многія кліенты адмовіліся ад прадукцыі, якую заказалі раней. Некаторыя таксама не маглі выплаціць свой доўг. У сувязі з гэтым мы зрабілі больш жорсткай сваю фінансавую дысцыпліну»,— падкрэсліў Нормундс Азалінш. Тым не менш фінансавыя паказчыкі на фоне зніжэння аб'ёму продажаў застаюцца стабільнымі. Кампанія прыняла шэраг дзеянняў, якія дазволілі ёй паменшыць сабекошт прадукцыі і павялічыць рэнтабельнасць. Чысты прыбытак 2014-га складае 99,2% у параўнанні з 2013 годам, без уліку курсавой розніцы — 109,2%.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ** ■

# «КІНО — САМЫ ДАРАГІ ВІД САМАВЫЯЎЛЕННЯ»

*Разабрацца ў паняцці «мастацтва кіно» — тое ж самае, што знайсці сэнс жыцця. Але ж калі пошукі сэнсу жыцця ніколі не спыняліся, то і спробы зразумець, у чым заключаецца сутнасць мастацтва кіно і яго адрозненне ад кінапрадукту, маюць права на існаванне. У гэтых пошуках да нас далучаюцца людзі са свету кінематографа. Яны раскажуць пра сваю працу, сваё бачанне кіно, пра метафізічнае і рэальнае, пра сусветнае і вузкасацыяльнае, пра важнае і банальна простае. Пасля добрага кіно мы становімся іншымі людзьмі. Магчыма, і гэтыя інтэрв'ю дапамогуць нам аддаліцца ад нязручных сацыяльных умоўнасцяў.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Што значыць знайсці патрэбнага для праекта рэжысёра? Гэта абумоўлена не толькі прафесіяналізмам?***

— Не, гэта абумоўлена ў першую чаргу яго густамі і поглядамі на жыццё. Калі ты хочаш зрабіць камедыю, то не будзеш запрашаць Андрэя Звягінцава, таму што ён схільны здымаць драматычныя гісторыі. Пытанне не проста ў прафесіяналізме. Павінен прыйсці той чалавек, які палюбіць менавіта гэтую гісторыю, гэты сюжэт і гэты жанр. Гэта як ажаніцца — стараешся ж па каханні. А чаму аднаму падабаецца адна жанчына, іншаму другая, а трэцяму — трэцяя? Гэта пытанне густаў. Такім жа чынам здымаюцца фільмы: трэба палюбіць тое, што робіш.

***— У дачыненні да расійскага кіно кажуць пра сцэнарны крызіс. Ён сапраўды існуе?***

— Так, гэта вечны крызіс, і не толькі ў Расіі. Амерыканцы, калі ў іх запытацца, таксама скажуць пра вялікую праблему са сцэнарыямі. Але ў нас гэтая праблема зараз стаіць асабліва востра.

***— На сучасным рускім экране прымільгаліся сіквелы, камедыі, адсылкі да Галівуда. Ды і ў вашай рэжысёрскай працы таксама былі зроблены пераход ад еўрапейскай кінамовы да галівудскай, калі вы знялі «Ціскі» і «Стыляг». Дзе ж гэтая загадкавая руская душа? Як выглядае нацыянальны кінапрадукт Расіі?***

— Я магу назваць фільмы, зробленыя пра сучасную і старую Расію. Усё гэта існуе і па-рознаму робіцца: «Сонечны ўдар» Нікіты Міхалкова, «Белыя ночы паштальёна Аляксея Трапіцына» Андрэя Канчалоўскага, «Доўгае шчаслівае жыццё» Барыса Хлебнікава. Руская душа нікуды не дзелася, проста індустрыя нацэлена на тое, каб зарабляць грошы. У расійскай індустрыі ёсць абгрунтаваная амбіцыя быць вялікай індустрыяй, а вялікая індустрыя можа існаваць тады, калі можа прыцягнуць вялікую колькасць гледачоў, забавіць іх і канкурыраваць з Галівудам (што вельмі складана). Фільмы Аляксея Мізгірова — фільмы пра нашу рэчаіснасць, карціны Аляксея Федарчэнкі не проста аб Расіі, а пра малыя народы, марыйцаў. Ёсць яшчэ «Левіяфан» Андрэя Звягінцава, які прыз у Канах атрымаў — ён таксама пра сучасную Расію. Наш кінематограф развіваецца па сваіх законах: глядацкіх, камерцыйных, аўтарскіх.

**«Галоўнае — у Мінску ёсць нейкі спакой і магчымасць засяродзіцца».**

***— Вы не думалі, што з вашым рэнамэ можаце фарміраваць нацыянальны прадукт?***

— Я лічу, што «Стылягі» — гэта нацыянальны прадукт, абсалютна. Гэта толькі форма мюзікла. Можна лічыць, што яна галівудская, хоць у Савецкім Саюзе таксама рабіліся мюзіклы (успомніце стужкі «Весёлые ребята», «Волга-Волга»). А ў «Стылягах» гісторыя, музыка, песні — усё наша. Я здымаў пра сваіх бацькоў; гэта былі савецкія людзі, якія хацелі жыць свабодна. Руская традыцыя — гэта не абавязкова Шукшын, вёска і фальклорны лубачны погляд на краіну. Кожны здымае пра тое, што яму блізка. Я вырас у тым свеце, у якім гісторыя стыляг — родная. А нехта нарадзіўся ў вёсцы на Алтаі, і яму цікава распавядаць пра сваіх аднавяскоўцаў. Я не магу зняць пра людзей з вёскі на Алтаі (можа, і мог бы, калі б палюбіў нейкую гісторыю) — проста імкнуся быць верным сваім адчуванням.

***— Кінематограф неяк вызначае факт, што асноўны глядач кінатэатраў у Расіі ды і ў Беларусі — падлеткі 12-14 гадоў?***

— Вядома, вызначае. Хочам мы гэтага ці не. Але, калі здымаем фільмы, думаем пра аўдыторыю. Менавіта таму на экране вялікая колькасць рамантычных камедый, баевікоў з ухілам да Галівуда, фільмаў са спецэфектамі. Гэта наша вялікае няшчасце. У амерыканскіх кінатэатрах вялікая колькасць дарослых гледачоў, а нашы дарослыя гэтую традыцыю страцілі, глядзяць кіно дома. Мы губляем гледача, таму нам цяжка акупіць фільмы.

***— Ці павінна нацыянальная кінематаграфія ставіць за мэту фарміраванне маральных арыенціраў?***

— Гэта велізарная ілюзія, што фільмам можна сфарміраваць маральныя арыенціры. Чалавек прыйшоў, паглядзеў фільм — і пайшоў. Напэўна, бываюць адзінкавыя выпадкі, калі глядач выйшаў з кінатэатра іншым чалавекам, але я ў гэта не веру. Ідэя выхавання мастацтвам вельмі сумнўная. Яе, здаецца, рухаў у масы Ленін у свой час, і камуністы на гэта «ціснулі». Але я думаю, як казаў Пушкін, якога ўсё радзей і радзей цытуюць: «И долго буду тем любезен я народу, что чувства добрые я лирой пробуждал». Дастаткова проста выклікаць добрыя пачуцці, прымусіць гледача расплакацца, расчуліцца, паспачуваць.



***— Вы аддалі перавагу здымкам серыяла «Адліга» замест фільма «Географ глобус прапіў». А чаму? У расійскай кінематаграфіі серыяльны фармат мае рэпутацыю недастаткова якаснага прадукту.***

— Цяпер лепшыя рэжысёры ў Расіі ідуць здымаць серыялы. Гэта модна, прэстыжна. Стала зразумела, што гэта не жанр другога гатунку; тое, пра што вы кажаце, было актуальна гадоў 8 таму. Для мяне стаіць пытанне не ў тым, у якім фармаце здымаць, а пра што здымаць. «Адлігу» я здымаў, таму што яе гісторыя была для мяне цікавейшая, а яе не распавядзеш за паўтары гадзіны.

**«Гэта велізарная ілюзія, што фільмам можна сфарміраваць маральныя арыенціры».**

***— Не шкадуеце, што фільм «Географ глобус прапіў» зняў Аляксандр Велядзінскі?***

— Не, ні секунды, ні разу. Чаму Велядзінскі выдатна зняў? Аказалася, што гэта «яго гісторыя». Прычым поспех фільма (а ён быў на кінафестывалях і ў гледача, што важна) сведчыць пра тое, што мы трапілі ў «яблычак». Я лічу, што Канстанцін Хабенскі сыграў добрага настаўніка, сумленнага, прыстойнага чалавека, які, хай і п'е, але здолеў знайсці агульную мову з дзецьмі і зрабіў для іх больш, чым іншыя. Я б хацеў такога настаўніка для сваіх дзяцей.

***— Для многіх акцёраў дэбютныя ролі ў вашых фільмах сталі дзвярыма ў кінематограф. У чым перавага работы з невядомымі асобамі?***

— Я працаваў у тым ліку і з вядомымі асобамі — такімі, як Алег Янкоўскі, Леанід Ярмольнік, Аліса ФрэйндлІх. Але мне падабаецца працаваць з новымі людзьмі, таму што ў гэтым ёсць прыгода. Артыст, якога ты бачыў тысячу разоў, часам прадказальны. А з новым можна адчуць, адкрыць нешта свежае. А часам нельга ўзяць новых, як у фільме «Палюбоўнік», сцэнарый якога быў напісаны для вялікага артыста Алега Янкоўскага.

***— Як вы ставіцеся да апошніх цэнзурных абмежаванняў у кіно?***

— Дрэнна. Я ўвогуле дрэнна стаўлюся да любой цэнзуры. Мне не падабаецца, што ў апошні час нас усё больш заціскаюць рамкі «тое нельга, гэта нельга». Ёсць разумныя рэчы з абмежаваннем «дзецям да 16», і на гэтым варта спыніцца. Але вось далей нам прапісваецца, колькі можна піць, колькі курыць, што казаць, а што не.

***— Магчыма, калі дзяржава вылучае грошы на кінематограф, яна можа дыктаваць умовы?***

— З аднаго боку, так. З іншага, дзяржава — гэта мы. Яна не мае сваіх грошай, гэта нашы агульныя грошы. А размеркаванне іх — гэта калектыўны дагавор паміж намі і дзяржавай.

***— Кажуць, што рэжысёр з усіх творцаў — самы залежны. Вы згодны?***

— Так, безумоўна. Таму што для таго, каб намаляваць карціну, патрэбна палатно, фарбы, а часам проста папера і ручка. Для таго, каб зняць фільм, патрэбны натоўп людзей, шмат тэхнікі, жалеза, апаратуры. Ты залежыш і ад грошай, і ад людзей, і ад гэтай апаратуры. Акрамя таго, ты залежыш ад надвор'я, настрою людзей, сітуацыі ў краіне (таму што кіно адразу рэагуе на крызісы). І самае галоўнае, ад чаго ты залежыш, — гэта, вядома, глядач. Я б сказаў так: кіно — самы дарагі від самавыяўлення. Гэта значна даражэй, чым спяваць, танцаваць, выбіваць чачотку, маляваць карціны. Таму так цяжка атрымаць магчымасць зняць свой фільм: ты павінен даказаць, што з грошай зробіш нешта сапраўды каштоўнае.

***— Поспех фільма наогул можна спрагназаваць?***

— Гэтым займаюцца ўсе з моманту ўзнікнення кіно. Часам удаецца, часам — не. Гарантый не існуе. Нягледзячы на тое, што на кінапраектах працуюць сотні і тысячы прафесіяналаў, элемент непрадказальнасці, цуду ўсё роўна застаецца. Мой сябар, прадзюсар Сяргей Сельянаў некалі сказаў: «Калі б я меў гарантыю таго, што фільм будзе паспяховым, мне было б нецікава яго здымаць». У непрадказальнасці ёсць нейкі азарт. Кіно — да ўсяго іншага самы рызыкоўны бізнес з усіх, якія існуюць. Пры гэтым усё роўна прыцягвае людзей.

***— Што такое мастацтва кіно ў процівагу масаваму кіно?***

— У апошнія гадоў 20 гэтыя паняцці змяшаліся. Усё больш складана размежаваць мэйнстрым і мастацтва. Ёсць паняцце арт-хауса — таго, што свядома зроблена для вузкай аўдыторыі, а шырокая зразумець не зможа. Але рэжысёры з сусветным іменем — Квенцін Таранціна, Гас ван Сэнт, браты Коэн, Ларс фон Трыер — атрымліваюць галоўныя прызы на кінафестывалях і ствараюць так званы арт-мэйнстрым, які і простыя людзі могуць глядзець, і крытыкі вывучаць.

***— Вы як глядач і будучы член журы асноўнага конкурсу кінафестывалю «Лістапад» што шукаеце ў кіно?***

— Часам рэжысёры любяць кіно рабіць, але мала глядзяць, а я люблю глядзець. Я дастаткова "нагледжаны" чалавек і разумею, што такое сучаснае кіно. Я, і як глядач, і як кінематаграфіст, шукаю добрае кіно, а яно — рознае. Калі гэта таленавіта, арыгінальна, то мне ўсё роўна: гэта камедыя, баявік ці складаны аўтарскі фільм. Калі кіно краніае, яно цікава зроблена і ў ім ёсць крупінка нечаканага, аўтарскага погляду на свет — значыць, гэта добрае кіно.

***— Вы часта здымаеце на тэрыторыі Беларусі. З чым гэта звязана?***

— У першую чаргу, Мінск — гэта горад, як кажуць цяпер, friendly для кіно. Тут няма затораў, можна проста пераехаць з месца на месца. Тут выдатная кінастудыя, дзе працуюць прафесіяналы, якіх я вельмі люблю. Тут можна здымаць і Мінск, і Маскву, і кавалачкі Савецкага Саюза. Галоўнае — там ёсць нейкі спакой і магчымасць засяродзіцца. Заўсёды лічылася, што мы едзем у Мінск, таму што там танней. Але калі ўлічыць, колькі каштуе пераезд усёй групы, артыстаў, нельга сказаць, што мы эканомім. Гэта ўжо не пытанне таннасці, а спакою, камфорту. Большую частку наступнай карціны я буду здымаць у Мінску і ўжо прадчуваю гэта. Мне падабаецца Мінск.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**



Кадр з фільма «Стылягі».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

23 КАСТРЫЧНІКА 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15755)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Аляксандр РЫБАК:

# «Мне дастаткова і Еўропы»


Фота Надзеі БУЖАН.

**Імя Аляксандра Рыбака вядомае беларускай публіцы ўжо не першы год. Як мінімум знаёмства з ім пачалося ў 2009 годзе, калі артыст перамог на конкурсе «Еўрабачанне», дзе прадстаўляў Нарвегію. Магчыма, тады яго запомнілі выключна як хлопца са скрыпкай, але насамрэч палітра талентаў Аляксандра куды больш разнастайная. Так, ён не толькі выпускае альбомы, здымае кліпы, але і агучвае кінаперсанажаў, піша саўндтрэкі да мультфільмаў, праводзіць майстар-класы для таленавітых дзяцей у многіх краінах. Днямі Аляксандр прыехаў у Беларусь з мэтай знайсці тут таленавітых дзяўчат для новага калектыву. Як адбываюцца пошукі, да каго ў госці абавязкова завітае спявак і чым вызначаецца для яго паспяховасць сёння, Рыбак расказаў на сустрэчы з журналістамі падчас кастынгу ў Мінску.**

*Дзяўчат, якія трапяць у каманду Аляксандра, чакае задача не з лёгкіх. Бо падрыхтоўка да нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» — справа адказная. І прадказаць, на чыім баку акажацца фартуна, не заўсёды ўдаецца. Чым жа абумоўлена ў гэты раз упэўненасць ва ўласным поспеху?*

— Ідэя ўзнікла даўно. Праўда, доўга не мог выбраць варыянт мелодыі. Я напісаў песню з фальклорным ухілам. Яна будзе называцца «Акцэнт». На «Еўрабачанні» мне хацелася б паказаць сапраўдную Беларусь — сціплую, чыстую і абаяльную, як яе дзяўчаты. І яны заспяваюць: «Заўсёды буду любіць цябе, і ты зможаш мне даверыцца, але акцэнт мой назаўсёды застанецца беларускім». Беларускія прадстаўнікі на конкурсе чамусьці імкнуцца прыпадабняцца пад некага, выступаюць добра ў музычным плане, але, калі казаць нават пра англійскую мову, то ў Еўропе прывыклі да іншага яе ўзроўню. Таму і хачу засяродзіць увагу ў песні на тое, што акцэнт можа быць сілай, а не слабасцю, калі гэта шчыра выглядае.

*У афішы кастынгаў пазначана, што прэтэндэнткі, якія хочуць патрапіць у гурт да вядомага артыста, павінны быць не маладзейшымі за 18 гадоў і любіць беларускі фальклор. Цікава, а як быць з іншымі параметрамі — мадэльнай знешнасцю альбо ўзростам?*

— Знешнасць не мае для нас першаснага значэння. Я не хачу сыграць на прывабнасці дзяўчат, бо ў Беларусі яны прыгожыя і мілыя, што не часта сустрэнеш у той жа Амерыцы. Галоўнае, каб яны верылі ў сябе, а гэта відаць на сцэне, паверце. І тады не важна фотамадэль дзяўчына ці не. Касцюмы, хутчэй за ўсё, уяўляюцца мне народнымі.

Мне не прынцыпова, як дзяўчына валодае англійскай мовай, але хацелася б, каб веды былі. Часам я цікаўлюся дыяпазонам вакальных магчымасцяў. Бо чамусьці дзяўчаты выбіраюць манеру спяваць у ніжнім рэгістры, а мне хочацца пачуць ад іх і высокія ноты.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Знайсці сябе

# «У МЯНЕ — БЕЛАРУСКАМОЎНЫ СВЕТАПОГЛЯД»

**Гісторый пра замежнікаў, якія цікавяцца беларускай мовай, культурай і гісторыяй, у апошнія гады становіцца ўсё больш. Відэа з бразільскай дзяўчынай, што спявае па-беларуску, аповеды беларускамоўных японца, брытанца і баска... Цікава, як жыхары іншых краін знаёмяцца з нашай культурай, знаходзячыся ўдалечыні ад Беларусі? Жыхар Саратава Мікалай КАЛАМАЦКІ ўпершыню пачуў беларускую мову некалькі гадоў таму. Жывучы за паўтары тысячы кіламетраў ад нас, хлопец самастойна вывучыў мову Купалы і Коласа, а цяпер шукае сабе ў інтэрнэце суразмоўцаў для заняткаў.**



***— Мікалай, што зацікавіла цябе ў Беларусі, нашай мове і культуры?***

— У кожнага чалавека ў жыцці настае момант, калі ён пачынае цікавіцца сваімі каранямі, гісторыяй сям'і. Мае бацькі нарадзіліся і жылі ў Расіі, але я ведаў, што бабуля ў свой час пераехала ў Омск ці то з Беларусі, ці то з Польшчы. Мяркую, што такое спрэчнае паходжанне можна патлумачыць тым, што яе радзіма — Брэст ці Брэстчына.

Мазаіка пачала складвацца яшчэ тады, калі я, гуляючы з іншымі дзецьмі, стаў усведамляць, што яны не разумеюць многіх слоў, добра вядомых мне. Напрыклад, слова «прыгожы». Калі мая маці была малая, бабуля вучыла яе казаць «я жыву на такой вуліцы ў доме нумар дваццаць пяць». Менавіта такое вось беларускае «у» і «нумар». Карацей кажучы, было шмат «зачэпак», праз якія можна было вызначыць, што я родам з Беларусі. З гэтага і пачалася цікавасць.

*(Заканчэнне на 7-й стар. «ЧЗ».)*

Закрытая тэма

# НЕ ВІРТУАЛЬНАЯ ПАГРОЗА,

## або Як абараніць дзіця ад сексуальнага гвалту

**Заманлівую прапанову атрымала ад італьянца 14-гадовая дзяўчынка, якая размясціла ў «Фэйсбуку» свае фатаграфіі, — прыехаць з сяброўкай у Італію на фотасесію. І хто яго ведае, чым бы скончылася гісторыя дзвюх беларускіх «папялушак», калі б не ўмяшанне грамадскага аб'яднання «Клуб дзелавых жанчын», на базе якога функцыянуе «гарачая лінія» па пытаннях бяспекі непаўналетніх у інтэрнэце і папярэджвання сексуальнага гвалту над дзецьмі. Дзяўчынкі самі звярнуліся на «гарачую лінію» з просьбай ім пасадзейнічаць і пераканаць бацькоў іх адпусціць, бо без дазволу апошніх выезд за мяжу немагчымы. Высветлілася, што сумненні бацькоў былі небеспадстаўныя: італьянскія «працадаўцы» наадрэз адмовіліся, каб пры здымках прысутнічалі бацькі юных «мадэляў», і ўвогуле не жадалі, каб тыя суправаджалі ў вандроўцы падлеткаў.**

### НЕПРЫСТОЙНЫЯ ПРАПАНОВЫ

— Ці вось яшчэ адзін выпадак. Тэлефанавалі дзяўчаты, якім не споўнілася 18 гадоў. Яны быццам бы выйгралі нейкі віртуальны конкурс, і ім прапанавалі работу мадэляў у Польшчы. Але без заключэння працоўных кантрактаў, — расказвае старшыня грамадскага аб'яднання «Клуб дзелавых жанчын» Ларыса ІСТОМАВА. — Было зразумела, што рызыка для дзяўчат дастаткова вялікая. Але тыя былі настроены рашуча. Да таго ж і бацькі дзяўчат заявілі нам, каб мы не ўмешваліся і не перашкаджалі. Маўляў, іх дзецям у жыцці выпаў унікальны шанц, а мы можам усё сапсаваць. Але ўмяшацца нам усё ж такі давялося, бо размова ішла пра вываз за мяжу на працу цэлай групы непаўналетніх (больш як пяць чалавек).

У сучасным свеце з развіццём інфармацыйных тэхналогій дзеці і падлеткі атрымліваюць усё больш прапаноў сумніўнага характару. У тым ліку прапановы паўдзельнічаць у розных «здымках»... Міжнародныя даследаванні паказваюць, што прапановы сексуальнага характару ад дарослых карыстальнікаў атрымлівае ў інтэрнэце кожнае пятае дзіця ва ўзросце ад 10 да 17 гадоў. Кожны момант у віртуальным павуцінні могуць знаходзіцца да 50 тысяч злачынцаў, якія спрабуюць заманіць у расстаўленыя сеткі новых ахвяр.

Міжнародная арганізацыя па міграцыі сумесна з МУС Беларусі пры падтрымцы Шведскага ўпраўлення міжнароднага развіцця і супрацоўніцтва запусціла ў нашай краіне інфармацыйную кампанію па папярэджванні сексуальнага гвалту над дзецьмі.

— Па міжнародных звестках, больш як 1 мільён дзяцей у свеце вымушаны прымаць удзел у порназдымках. Парнаграфічныя матэрыялы з удзелам дзяцей змяшчаюць каля 4 мільёнаў сайтаў у інтэрнэце. Пры гэтым штодзённа ствараецца каля 500 новых падобных рэсурсаў, — расказвае **кіраўнік праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Умацаванне нацыянальнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь у сферы процідзеяння гандлю людзьмі» Наталля ЖАК**. — Па некаторых звестках, каля трэці дзяцей падвяргаюцца гвалту праз інтэрнэт, але толькі ў 10% выпадкаў іх бацькі або сваякі, адказныя за гэтых дзяцей, здагадваюцца пра тое, што адбываецца. А дзіця трапляе ў замкнёнае кола, з якога проста немагчыма выбрацца самастойна.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 10 2014 г.

*І так бывае*

# УРОКІ... ПАД «НАГЛЯДАМ» ПАЛІЦЭЙСКІХ

**Супрацоўнікі паліцыі Стакгольма дапамаглі школьніку зрабіць хатняе заданне, паведамляе The Local.**

11-гадовы хлопчык быў дома адзін, калі пачуў падазроныя гукі. Напалоханае дзіця патэлефанавала ў паліцыю. Паліцэйскія, якія прыбылі па выкліку, праверылі жыллё і не знайшлі там ні злачынцаў, ні слядоў узлому.

Аднак дзіця ўсё роўна выглядала засмучаным. Высветлілася, што хлопчык не выканаў хатняе заданне па матэматыцы. Паліцэйскія вырашылі дапамагчы школьніку з урокамі, пра што і адрапартавалі на сваёй старонцы ў Twitter.

Таксама супрацоўнікі паліцыі пахвалілі хлопчыка за пільнасць. «Нават калі гэта быў не злачынца, то хлопчык усё роўна паступіў правільна», — заявіў паліцэйскі Віктар Адолфсан.

*Класныя навіны*

# У ШКОЛУ — З ЭЛЕКТРОННЫМІ СШЫТКАМІ

**З ідэяй укаранення ў адукацыйны працэс электронных сшыткаў выступіла ініцыятыўная група педагогаў Масквы.**

Па словах аўтара ноу-хау Стэлы Наркаевай, адзін электронны сшытак зможа замяніць вялікую колькасць сшыткаў па розных прадметах. У электроннай версіі сшытка кантраляваць вучня будзе спецыяльна закладзеная праграма. Аснову сшытка складаюць інтэрактыўныя лісты, разбітыя на некалькі блокаў: тэарэтычны матэрыял, практычны — з віртуальнымі дэманстрацыямі і рознаўзроўневымі заданнямі, а таксама блок кантролю ведаў з тэстамі і практыкаваннямі, якія настаўнік і вучань змогуць дасылаць адзін аднаму па інтэрнэце. Звязаць з электронным падручнікам такі сшытак прапануецца пры дапамозе гіперспасылак. Мяркуецца, што гэтае ўстройства будзе карысна асабліва тым дзецям, якія навучаюцца дыстанцыйна і не могуць наведваць школьныя заняткі.

*Ну і ну!*

# МАБІЛЬНІК — ПРЫЧЫНА ЗАЛІШНЯЙ ВАГІ?

**Вучоныя з універсітэта Гранады (Іспанія) высветлілі, што звычка заражаць электронныя ўстройствы ноччу паблізу ад спальнага месца можа прывесці да набору лішняй вагі.**

Цьмянае святло індыкатараў на зарадных устройствах, таксама як і працуючы тэлевізар або камп'ютар, вельмі негатыўна ўплываюць на выпрацоўку ў арганізме мелатаніну. Мелатанін (ён жа гармон сну) спрыяе эфектыўнамуператварэнню ў арганізме спажываемай ежы і вадкасці ў энергію. Такім чынам, звычка спаць пры працуючым тэлевізары або камп'ютары і заражаць гаджэты побач з ложкам павышае рызыку набраць лішнюю вагу і нават захварэць на дыябет.

Навукоўцы рэкамендуюць спаць у поўнай цемры, каб нішто не перашкаджала выпрацоўцы мелатаніну.

*Запрашальнік*

# ІНТЭРАКТЫЎ НА СВЕЖЫМ ПАВЕТРЫ

**З 25 кастрычніка па 2 лістапада Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі і інтэрнэт-праект Свята.by запрашаюць самых вясёлых, смелых, актыўных і дапытлівых школьнікаў і іх бацькоў у Батанічны сад.**

На працягу асенніх канікул — цэлых 9 дзён запар — кожны ахвотны зможа пагрузіцца ў атмасферу казкі, любімага мультфільма, фільма і нават серыяла. Папялушка, Чалавек-Павук, Бэтмэн, Супермен, Гары Потэр, Беласнежка, героі Зорных войнаў — з усімі імі можна будзе сустрэцца ў Батанічным садзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НЕ ВІРТУАЛЬНАЯ ПАГРОЗА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У рамках праекта былі створаны два сацыяльныя ролікі, нацэленыя на прыцягненне ўвагі бацькоў і тых, хто нясе адказнасць за дзяцей, да праблемы дзіцячай бяспекі, у тым ліку ў інтэрнэце. Відэаролікі павінны пераканаць дарослых у тым, што яны могуць разлічваць на дапамогу і падтрымку ў любой, нават самай складанай сітуацыі, з боку падрыхтаваных спецыялістаў. Галоўнае — не хавацца ад праблемы і зносін з дзіцем.



## «Кіберпаляванне» ў сеціве

Паводле статыстыкі Міністэрства ўнутраных спраў, у Беларусі за 8 месяцаў гэтага года было выяўлена 75 пацярпелых ад злачынстваў, звязаных з педафіліяй.

— Усяго міліцыя выявіла 102 злачынствы, звязаныя з педафіліяй, — канстатуе **начальнік аддзела па процідзеянні міждзяржаўнаму гандлю людзьмі Упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлем людзьмі МУС Беларусі Дзмітрый ЦАЮН**. — Сярод іх 8 згвалтаванняў і больш як 50 прымусовых дзеянняў сексуальнага характару. Таксама выяўлены 33 злачынствы ў сферы вырабу і распаўсюджвання дзіцячай парнаграфіі. Адно са злачынстваў было здзейснена арганізаванай групай, а 25 — з дапамогай інтэрнэту.

**Звычайна «кіберпаляўнічы» заходзіць у тыя месцы ў сусветным павуцінні, дзе збіраюцца падлеткі, уключаючы чаты, форумы, анлайнавыя гульні.**

Кіберпрастора дае магчымасць устанаўліваць кантакты з дзецьмі без ведама дарослых, што ў рэальным свеце зрабіць больш праблематычна. Звычайна «кіберпаляўнічы» заходзіць у тыя месцы ў сусветным павуцінні, дзе збіраюцца падлеткі, уключаючы чаты, форумы, анлайнавыя гульні, і можа назіраць за іх удзельнікамі ці ўступаць з імі ў кантакт.

Такія «паляўнічыя», як правіла, добрыя псіхолагі і вызначаюць патэнцыяльна ўразлівых дзяцей, якія выглядаюць адзінокімі, чымсьці расстроенымі, ці тых, хто шукае дапамогу і падтрымку. Зламыснік зацікаўлена выслухоўвае праблемы сваіх віртуальных субяседнікаў, спачувае ім, заваёўваючы іх давер, і... паступова пачынае ўцягваць у размовы пра секс, дэманстраваць матэрыялы эратычнага зместу, спрабуючы аслабіць маральныя «тармазы» ў непаўналетніх. Пасля ўстанаўлення кантакту анлайн дарослы пачынае пераконваць дзіця перайсці з публічнага чату ў больш адасобленае месца.

Зразумела, што не заўсёды ўзаемадзеянне ў сетцы даходзіць да насілля. Стадыя ўгаворвання дзіцяці можа абарвацца ў любы момант. Дзіця ці падлетак можа і не пагадзіцца перайсці ў адасоблены чат. Або пры ўзаемадзеянні са сваім віртуальным «сябрам» дзіця можа штосьці насцярожыць, і яно проста заблакіруе суразмоўцу, перастане выходзіць на сувязь з ім. Таму злачынцы дзейнічаюць у сетцы пад рознымі «нікамі». І калі яны выбралі для сябе ахвяру, могуць прадстаўляцца дзіцяці і дзесяццю «імёнамі», пакуль не дасягнуць сваёй мэты.

## Пра што не гавораць услых

— На жаль, але мы сутыкаемся з тым, што наша грамадства недастаткова сур'ёзна ўспрымае пагрозы, якія прысутнічаюць у віртуальнай прасторы, у тым ліку пагрозу педафіліі і дзіцячай парнаграфіі, — канстатуе **старшыня мінскага грамадскага аб'яднання па прадухіленні жорсткага абыходжання з дзецьмі «Дзеці — не для насілля» Маргарыта ПРАХІНА.** — Больш за тое, нам даводзіцца чуць папрокі ў тым, што сваёй прафілактычнай работай мы можам выклікаць у падлеткаў нездаровую цікаўнасць да парнаграфіі. Але паверце, што падлеткі сёння больш «адукаваныя» ў гэтай тэме, чым педагогі або бацькі.

У 2011 годзе пры падтрымцы Міжнароднай арганізацыі па міграцыі мы праводзілі лакальнае даследаванне па праблеме дзіцячай парнаграфіі. Больш за 90% апытаных падлеткаў заявілі, што яны знаёмыя з парнаграфіяй, і тлумачылі сваімі словамі, што разумеюць пад парнаграфіяй. Больш за 60% пры гэтым прызналіся, што бачылі парнаграфічныя выявы неаднаразова, а сярод дзяцей 12-13 гадоў неаднаразова бачылі такую прадукцыю 35 працэнтаў апытаных. У большасці дзяцей і падлеткаў сексуальныя матэрыялы выклікаюць трывогу і хваляванне, але ў некаторых непаўналетніх можа ўзнікнуць залежнасць ад парнаграфіі. А для пэўнай часткі аўдыторыі прагляд парнаграфіі ў далейшым становіцца стымулам да пераймання і ўдзелу ў вырабе порназдымкаў.

Вынікі даследавання таксама паказалі, што больш за 20% падлеткаў лічаць, што здымацца ў матэрыялах парнаграфічнага характару — крута і модна. На жаль, але такая «мода» прыводзіць да таго, што падлеткі не проста вырабляюць свае «эратычныя», як яны кажуць, фотаздымкі, але і размяшчаюць іх на старонках у сацыяльных сетках ці адсылаюць «віртуальным сябрам».

98% дзяцей маюць стасункі ў сацыяльных сетках. 60% з іх сустракаліся з сябрамі, з якімі пазнаёміліся ў інтэрнэце, у рэальным жыцці. І 30 працэнтаў з іх сказалі, што ў іх віртуальныя сябры не адпавядалі свайму вобразу, створанаму ў інтэрнэце. Прычым «сябры» не адпавядалі не толькі ўзросту, але часам і згаданому полу.

## Кляймо на ўсё жыццё

— Як правіла, дзеці, уцягнутыя ў выраб парнаграфічных матэрыялаў, атрымліваюць вельмі сур'ёзную псіхалагічную траўму, — тлумачыць Маргарыта Прахіна. — Наступствы могуць быць такія ж, як і ў дзяцей, якія пацярпелі ад сексуальнага гвалту. Фотаздымкі і фільмы парнаграфічнага зместу цыркулююць у сеціве гадамі. Яны становяцца даступнымі для мільёнаў патэнцыяльных гледачоў, і разуменне таго, што ў кожны момант іх праглядаюць тысячы людзей, што фотаздымкі могуць капіравацца і распаўсюджвацца, а ты не можаш іх выдаліць з інтэрнэту, маральна прыгнятае дзіця...

Сёння тэхнічныя магчымасці дазваляюць аб'яднаць дзве выявы ў адну або сказіць іх для атрымання новай выявы. У выніку непарнаграфічныя выявы дзяцей можна ператвараць у парнаграфічныя або ствараць выявы віртуальных дзяцей.

— Мы заўсёды тлумачым бацькам, што ніхто не мае права фатаграфаваць іх дзяцей, нават у дзіцячым садку, без дазволу бацькоў. Але бацькі і самі ахвотна дасылаюць фатаграфіі сваіх дзяцей для ўдзелу ў розных віртуальных конкурсах і не бачаць у гэтым небяспекі, — падкрэслівае Маргарыта Прахіна.— Вельмі важна наладзіць адкрытыя ўзаемаадносіны, каб дзеці бачылі, што ў выпадку небяспекі бацькі іх зразумеюць і падтрымаюць. Трэба дамовіцца з дзіцем, што яно абавязкова раскажа, калі хтосьці захоча яго сфатаграфаваць. Нават калі гэта будзе добра знаёмы дзіцяці чалавек. Дзецям трэба ведаць, што ў іх ёсць права сказаць «не» чалавеку, які пужае сваімі паводзінамі і просьбамі.

Праблема сексуальнага гвалту застаецца дастаткова закрытай практычна ў любым грамадстве. Большасці бацькоў нават цяжка ўявіць, што такое можа адбыцца з іх дзіцем. Яны не жадаюць размаўляць з ім пра магчымыя пагрозы, каб абараніць ад негатыўнай інфармацыі, але самі дзяцей не могуць ведаць, як паводзіць сябе ў небяспечнай сітуацыі. Гэтаму іх павінны навучыць бацькі.

Калі дзіця пацярпела ад сексуальнага гвалту, яно, хутчэй за ўсё, не раскажа пра гэта. Дзеці могуць захоўваць маўчанне таму, што адчуваюць віну або не жадаюць засмучаць сваіх бацькоў. Злачынцы, які здзейсніў гвалт, можа запужваць дзіця ці сказаць, што яму ніхто не паверыць. Здараецца і так, што злачынца пачынае рабіць дзіцяці падарункі або прапануе «трымаць у тайне тое, што адбылося».

Маргарыта Прахіна раіць: перш за ўсё будзьце сябрам для свайго дзіцяці, чалавекам, якому яно даверае. Скажыце, што дзіця можа расказваць вам аб усім. Паабяцайце, што не будзеце злавацца, што б з ім ні адбылося. Калі дзіця расказала пра гвалт, пастарайцеся не напалохаць яго сваёй рэакцыяй. Абавязкова звярніцеся да спецыялістаў, якія могуць прафесійна дапамагчы дзіцяці, не займайцеся расследаваннем самі, а паведаміце пра тое, што адбылося, у адпаведныя арганізацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Кансультацыі па пытаннях бяспекі непаўналетніх у інтэрнэце і папярэджвання сексуальнага гвалту над дзецьмі**

**«гарачая лінія»**
**8 801 201 5555**

**званок бясплатны для абанентаў Велком, МТС і з гарадскіх тэлефонаў**

**Ананімнасць гарантуецца**

### ПАРАДЫ БАЦЬКАМ:

**1.** Складзіце правілы бяспечных паводзін у інтэрнэце, а таксама алгарытм паводзін дзіцяці пры сутыкненні з небяспечным незнаёмцам або сексуальным дамаганнем.

**2.** Распытайце дзіця пра яго «віртуальных сяброў», пацікаўцеся, для чаго ён выкарыстоўвае інтэрнэт.

**3.** Патлумачце дзіцяці, што нельга высылаць віртуальным знаёмым свае фотаздымкі і асабістую інфармацыю.

**4.** Устанаўлівайце праграмы, якія спыняюць доступ да сайтаў эратычнага і парнаграфічнага зместу.

**5.** Будзьце сябрам свайму дзіцяці, цікаўцеся яго захапленнямі і абмяркоўвайце ўсе праблемы, якія ўзнікаюць.

### ПАРАДЫ ДЗЕЦЯМ І ПАДЛЕТКАМ:

**1.** Не паддавайцеся на ўгаворы незнаёмцаў сустрэцца асабіста або абмяняцца фота і тэлефонамі, не паведаміўшы пра гэта бацькам.

**2.** Аберагайце сваё асабістае жыццё і інфармацыю пра яго ад віртуальных «сяброў». Вы не можаце ведаць, кім ваш віртуальны «сябар» можа аказацца ў рэальным жыцці, таму давяраць незнаёмцу, і тым больш выкладваць яму асабістую інфармацыю пра сябе, пра сваю сям'ю, дасылаць яму свае фатаграфіі, нельга катэгарычна.

**3.** Не рэгіструйцеся на сайтах знаёмстваў для дарослых і не ўводзьце субяседнікаў у зман наконт свайго ўзросту.

**4.** Калі інтэрнэт-знаёмства зайшло больш далёка, чым дазваляюць вам бацькі, і вы адчуваеце, што яно становіцца небяспечным, скажыце пра гэта маці ці бацьку.

## З пошты Чырвонкі

### ПРЫНЕСЛІ РАДАСЦЬ УСЁЙ СЯМ'І

**Кацярына ГРЫНЬКО, вучаніца 10 класа гімназіі №3 г. Магілёва:**

*«Я ўдзельнічала ў папярэднім конкурсе «Мы — такія!..» Хачу выказаць вялікую падзяку за тое, што мая праца «Боль у сінім сшытку» пра маю прабабулю была высока ацэнена і ўключана ў спіс пераможцаў. Цікава, што артыкул быў апублікаваны ў дзень нараджэння прабабулі. Вы прынеслі радасць усёй нашай сям'і. Колькі было ўспамінаў, размоў, слёз... Вялікі дзякуй!*

*Цяпер ідзе новы навучальны год. А я хачу прыгадаць свой летні адпачынак. Канікулы былі вельмі вясёлыя і цікавыя. Кожнае лета я езджу адпачываць у санаторый «Ружанскі», які знаходзіцца ў Брэсцкай вобласці (дарэчы, там і застала мяне навіна аб выніках конкурсу). Я знайшла новых сяброў і сустрэлася са старымі. Вы ведаеце, там было так цудоўна!.. Я буду вельмі сумаваць па лагеры і чакаць наступнага лета».*

### НЕ СТРАЦІЦЬ ЦІКАВАСЦЬ ДА ПРАФЕСІІ

**Юлія ЯНУКОВІЧ, вучаніца 10 класа Параф'янаўскай СШ Докшыцкага раёна:**

*«Стосы сшыткаў, падручнікі, планы-канспекты — усё гэта акружае мяне з ранняга дзяцінства. А ўсё таму, што мая мама — настаўніца. Назіраючы кожны вечар за тым, як яна працуе, я зразумела, што быць настаўнікам — нялёгка. Тым не менш мама здолела не страціць цікавасць да прафесіі і любоў да дзяцей.*

*Жывучы побач з маці-настаўніцай, магу з упэўненасцю сказаць, што педагог не толькі вучыць, але і сам вучыцца ўсё жыццё, займаецца самаадукацыяй, самаўдасканальваецца. Нельга стаць настаўнікам, проста атрымаўшы дыплом. Настаўнік — гэта прызванне.*

*Мама з'яўляецца прыкладам дабрыні, цярплівасці і справядлівасці не толькі для сваіх вучняў, але і ў першую чаргу для мяне. Яна заўсёды вучыць заставацца чалавекам у любой жыццёвай сітуацыі».*

### АПОШНЯЕ ЛЕТА ДЗЯЦІНСТВА

**Вераніка ВЕЛЬБ, вучаніца 11 класа СШ №8 г. Ліда:**

*«Лета... Гэта чатыры літары? Альбо 135 360 хвілін? Усё, што сказана, — таксама яно. Але перш-наперш лета — гэта час, калі не трэба запамінаць, як размнажаюцца хвойныя дрэвы, калі ставіцца працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, колькі важыць атам, вучыць тэарэму Піфагора. Гэта час, калі можна прыходзіць дадому па дарозе, асвечанай Месяцам, калі з упэўненасцю, што не захварэеш, можна выходзіць на дах і глядзець на зоркі... Сёлета я скончыла дзясяты клас, і гэта было маё апошняе паўнавартаснае лета...»*

**Лісты чытаў Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Ніякіх стандартаў*

# ДАПЫТЛІВЫЯ РОЗУМЫ — КРАІНЕ ПАДТРЫМКА

## У Мінску адбылася трэцяя рэспубліканская канферэнцыя «Павестка-2015» унікальнага праекта «Разумныя сеткі»

**Аб ім, напэўна, чуў кожны малады вучоны ці студэнт-старшакурснік: праграма па пошуку, падрыхтоўцы аналітыкаў для органаў дзяржкіравання была запушчана два гады таму і аб'ядноўвае ўжо каля 170 інтэлектуалаў ва ўзросце да 35 гадоў. Гэтым разам у Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сабралася больш за 50 аналітыкаў, якія актыўна абмяркоўвалі дарагія крэдыты і рост сукупнага ўнутранага прадукту, мадэрнізацыю сістэмы адукацыі і палітыку інфарматызацыі. У прыватнасці, адзін з выступоўцаў нагул прапанаваў у будучыні... перанесці сталіцу нашай краіны ў іншае месца. А каб размова прайшла ў форме дыялогу, на канферэнцыю былі запрошаны таксама эксперты з дзяржаўных устаноў.**



Фота БЕЛТА.

— Міністэрства эканомікі звярнулася ў Адміністрацыю Прэзідэнта з ініцыятывай стаць нашым сузаснавальнікам, — паведаміў удзельнікам **намеснік дырэктара Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, каардынатар праекта «Разумныя сеткі» Аляксей МАЦАВІЛА.** — Гэта ведамства ўжо даўно падтрымлівае наш праект, і некаторыя з яго ўдзельнікаў плённа працуюць у міністэрстве. Таму ініцыятыва знайшла падтрымку.

У сваю чаргу, **Аляксей ДЗЕРБІН, дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,** адзначыў, што аналітыка сёння запатрабавана на дзяржаўным узроўні і ад яе чакаюць нестандартных рашэнняў, якія садзейнічалі б развіццю краіны.

### АБ ЧЫМ РАЗВАЖАЛІ?

**Сяргей ГРУНТОВІЧ, студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі:**

— Я даследаваў магчымасць выкарыстання сацыяльных сетак для кантактавання дзяржарганізацый з насельніцтвам і прыйшоў да высновы, што гэта эфектыўны інструмент узаемасувязі і наладжвання дыялогу. Дарэчы, сваю супольнасць «УКантакце» мае, напрыклад, Міністэрства абароны.

**Яўген НОСАЎ, магістрант Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:**

— Мая тэма прысвечана аўтаматызаванай сістэме маніторынгу інфармацыйнай прасторы. Актуальнасць гэтай ідэі ў тым, што вялікая частка людзей атрымлівае інфармацыю толькі праз інтэрнэт. І нам, безумоўна, трэба ведаць настрої інтэрнэт-карыстальнікаў, якія можна вывучаць па іх каментарыях. У адрозненне ад сацыяльных апытанняў, мы можам аператыўна атрымаць інфармацыю ў рэжыме рэальнага часу. На якім партале сядзяць самыя злыя каментатары? Яны паўсюль. І адной з функцыянальных магчымасцяў гэтай сістэмы з'яўляецца выяўленне груп уплыву, якія накручваюць «лайкі» і масава каментуюць навіны ў пэўнай танальнасці. Усё намі робіцца таксама і дзеля таго, каб ведаць, хто спрабуе праз каментарыі ўплываць на нашу грамадскую думку.

**Яўген БАГАШОЎ, малодшы навуковы супрацоўнік Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў:**

— Я неяк задумаўся: а якая ў нас можа быць нацыянальная ідэя? І ў мяне ўзнікла ідэя аб пабудове новага горада. Наш народ не вельмі сацыяльна актыўны. І будаўніцтва новага горада паспрыяла б агульнаму з'яднанню, як гэта было ў пасляваенныя гады, калі аднаўлялі разбураны Мінск. Што тычыцца пераносу сталіцы ў іншае месца, гэта даволі радыкальны, нават фантастычны крок. Ведаю, што многія былі б незадаволены гэтым. Аднак чаму б і не?

**Якаў ЖУРБІН.**

*Свой выбар*

# ЦІ МОЖНА Ў ПЕДАГАГІЧНЫ... З ІРАКЕЗАМ?

## або Што пра гэта думае рэктар

**Тэматычная змена «Ад захаплення да педагагічнай прафесіі» прайшла ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». Яна сабрала амаль тры сотні вучняў (лідараў школьнага самакіравання, грамадскіх аб'яднанняў), якія хочуць звязаць свой лёс з няпростай, але вельмі цікавай і высакароднай прафесіяй. Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка вырашыў арганізаваць для сваіх патэнцыяльных абітурыентаў вялікае свята, таму ў «Зубраняці» высадзіўся сапраўдны «дэсант»: перад школьнікамі выступілі каманда КВЗ «Лепшыя сябры», народны ансамбль «РЭЙ», ансамбль скрыпачоў «Anno Domini» і танцавальны калектыў «О2».**



...Рэктара БДПУ Аляксандра Жука вельмі цікавіла, якім уяўляюць сабе сучаснага педагога дзеці і адкуль у іх узнікла жаданне стаць настаўнікам. Хто паўплываў на іх выбар? Школьныя педагогі ці бацькі? Аказалася, што ў многіх сем'ях маці альбо бацька працуюць на «педагагічнай ніве», а некаторыя дзеці і ўвогуле паходзяць з настаўніцкіх дынастый. Але ж многія прымалі такое рашэнне самастойна. Пра свой выбар распавяла **дзесяцікласніца Таццяна АРДЗЮК з Ліды:**

— Я вельмі люблю дзяцей. Зараз займаюся ў школьным тэатральным гуртку і ўжо маю досвед працы з малодшымі школьнікамі. У будучым хачу стаць выкладчыкам рускай мовы і літаратуры і англійскай мовы.

— Гэта магчыма, бо ў нас ёсць адпаведная спецыяльнасць, — падтрымаў школьніцу Аляксандр Іванавіч.

Рэктар адзначыў, што валоданне замежнай мовай на камунікатыўным узроўні стала абавязковым атрыбутам сучаснага чалавека. Але і ў сярэдняй, і ў вышэйшай школе праблемы з «моўным пытаннем» ёсць: не хапае вучэбных гадзін і размоўнай практыкі. Высветлілася, што сярод удзельнікаў «круглага стала» толькі некалькі школьнікаў добра валодаюць мовай і могуць свабодна камунікаваць з іншаземцамі — гэта, па меркаванні Аляксандра Жука, выразна ілюструе сітуацыю. Ён прапанаваў дырэктару «Зубраняці» Надзеі Ануфрыевай запрашаць у цэнтр гасцей з Англіі і іншых краін. Пры гэтым запэўніў школьнікаў, што на базе БДПУ ўжо ствараюцца ўмовы для засваення студэнтамі замежных моў.

**Арцём УЛАСАЎ са слуцкай школы №6** пацікавіўся ў госця:

— А як заахвочваюць студэнтаў ва ўніверсітэце?

— Відаць па ўсім, гэты малады чалавек сур'ёзна зацікаўлены паступленнем да нас, — усміхнуўся рэктар. — Магу пахваліцца: БДПУ — адзіная беларуская ВНУ, якая сёлета забяспечыла ўсіх першакурснікаў жыллём. У нас дзейнічаюць розныя сістэмы заахвочвання: міжнародныя адукацыйныя гранты, універсітэцкія і прэзідэнцкія прэміі. Працуюць праграмы па абмене студэнтамі — самыя актыўныя навучэнцы БДПУ праходзяць стажыроўку ў Італіі, Фінляндыі і іншых краінах Еўропы.

**Вучаніца брэсцкай сярэдняй школы №8 Кацярына РАЗАНОВІЧ** вырашыла даведацца: ці дзейнічае ва ўніверсітэце дрэс-код? «Хлопцаў і дзяўчат з іракезамі я ў сценах нашага ўніверсітэта не заўважаю, — прызнаўся Аляксандр Жук. — Усе людзі — дарослыя і ведаюць, як трэба выглядаць, каб адпавядаць дзелавой абстаноўцы».

**Ірына ЖУШМА з Іванава** пацікавілася, якая спецыяльнасць карыстаецца найбольшай папулярнасцю ў БДПУ. Аляксандр Жук паведаміў, што на ўсе ўніверсітэцкія спецыяльнасці прахадныя балы сёлета павысіліся, і ўсё ж у фаварытах — камп'ютарная графіка, фізічная культура і сацыяльная псіхалогія.

**Марыя МАРЦУЛЕВІЧ** запыталася ў рэктара: якім ён бачыць ідэальнага педагога сучаснасці?

— Вобраз настаўніка XXI стагоддзя амаль спісаны з пераможцы сёлетняга конкурсу «Настаўнік года—2014», выкладчыка гісторыі з Маладзечна Віктара Жука. Ён актыўна выкарыстоўвае новыя тэхналогіі — у сацыяльных сетках можа і пракансультаваць сваіх вучняў, і даць ім заданне, — падзяліўся сваім бачаннем кіраўнік педагагічнага ўніверсітэта. — Сёння інфармацыі вельмі шмат, і ў сувязі з гэтым задача настаўніка змянілася: у першую чаргу ён павінен арганізаваць працэс засваення ведаў, развіць у сваіх выхаванцаў уменне вучыцца. А навучанне павінна працягвацца праз усё жыццё.

Аляксандр Жук таксама падзяліўся са школьнікамі сваёй марай — адрадзіць у Мінску педагагічную гімназію. Але пачынаць трэба з педагагічных класаў. Да слова, першыя педагагічныя класы фізіка-матэматычнага і філалагічнага профіляў ужо адкрыліся на базе 20-й сталічнай гімназіі.

Падсумоўваючы, рэктар дадаў:

— Дзіцячы садок і школа закладваюць падмурак асобы. Напэўна, усе памятаюць сваю першую настаўніцу — гэты чалавек пакідае след у нашай душы на ўсё жыццё. Раней перад настаўнікам здымалі капелюшы. Сёння прывабнасць прафесіі знізілася ў немалой ступені з-за невысокіх заробкаў. Але зразумейце, што не ўсё вымяраецца грашыма: добры спецыяліст ведае сабе кошт. Дарэчы, БДПУ сумесна з Міністэрствам адукацыі ўжо працуюць над праграмай сацыяльнай падтрымкі настаўнікаў — ільготным крэдытаваннем, зніжкамі на інтэрнэт і мабільную сувязь. Мы зробім усё для таго, каб настаўнік адчуваў сябе ўпэўнена і прафесія педагога зноў стала прэстыжнай.

Завяршэннем дыялогу стала падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве БДПУ імя М. Танка і НДЦ «Зубраня». Цяпер яны будуць сябраваць: на летнюю практыку сюды будуць накіроўвацца студэнты, каб бліжэй пазнаёміцца з будучай прафесіяй і папрацаваць важатымі.

**Кацярына РАДЗЮК.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 10 2014 г.

Нефармальная адукацыя

# ЦІ ЛЁГКА ЗАБІЦЬ «ФІНАНСАВЫ ГОЛ»?

**Ці ведаеце вы пра такі футбол, у якім не трэба быць выдатным галкіперам альбо нападаючым? У гэтай гульні перамагае каманда, якая хутка і правільна адказвае на эканамічныя пытанні — і так «забівае галы» свайму саперніку. Карэспандэнт «Чырвонкі» наведала паўфінал сталічнага турніру па камп'ютарнай гульні «Фінансавы футбол» і ўбачыла на свае вочы, што гэта за спаборніцтвы.**

Замест звыклага футбольнага газона — праектар з віртуальным полем. «Фінансавы футбол» — гэта сімулятар вядомай гульні, дзе замест пасаў трэба адказваць на пытанні па тэмах: кіраванне асабістым бюджэтам, граматнае карыстанне крэдытам, пластыкавай карткай і іншымі банкаўскімі паслугамі. У камандзе — па сем чалавек, якімі кіруе капітан, ён жа адказвае і на пытанні. Перад пачаткам кожнага матча каманда выбірае, за якую краіну будзе гуляць. Школьнікі кіруюцца футбольнымі густамі, спадзеючыся, што гэта ім дапаможа.

**Каб забіць гол, ім трэба адказаць на пытанне: «Як паўплывае наяўнасць нерухомасці на атрыманне крэдыту?» На гэты раз яны пасуюць не туды, і мяч пераходзіць да іх сапернікаў.**

...Гуляюць зборныя «Англіі» і «Беларусі» — Ленінскі раён супраць Маскоўскага. Каманды сабраліся з духам: «матч» доўжыцца ўсяго пяць хвілін, і за гэты час трэба паспець накідаць пару-тройку галоў свайму саперніку. Першы пас — і перад капітанам выбар узроўню: лёгкае, сярэдняе ці складанае пытанне? Па правілах, чым больш складанае пытанне, тым менш пасаў трэба зрабіць. Ён хоча забіць гол як мага хутчэй.

***— Калі нехта сапсаваў сваю крэдытную гісторыю, то...***

— На табло ўзнікаюць варыянты адказаў. Капітан, не доўга думаючы, выбірае першы. Гэта правільны адказ, і гульня працягваецца далей. Ізноў пас — зноў выбар: таксама спыняюцца на складаным пытанні. На маніторы высвечваюцца ўсяго два адказы — «так» альбо «не». Каманда зноў выбірае правільны варыянт і пасуе далей. Увага, небяспечны момант: хлопцы б'юць па варотах! Каб забіць гол, ім трэба адказаць на пытанне: «Як паўплывае наяўнасць нерухомасці на атрыманне крэдыту?» На гэты раз яны пасуюць не туды, і мяч пераходзіць да іх сапернікаў. Пакуль у каманды зборнай Англіі ёсць з дзясятак секунд, каб ачомацца, зборная Беларусі адказвае на пытанне: «Якога віду страхавання не існуе?». Але раптам гучыць сігнал — час для кароткага перапынку. Прайшлі дзве з паловай хвіліны — гэта палова матча. Камандам трэба сабрацца. Дзесяць секунд — і гульня пачынаецца зноў... Што такое дэфляцыя? Што адбываецца з імпартнымі таварамі, калі адбываецца дэвальвацыя нацыянальнай валюты? Што трэба зрабіць, калі вы забылі пін-код вашай карткі? Правільныя пасы-адказы ідуць адзін за адным, але гучыць фінальны свісток. На табло — нічыя 0:0. Серыя пенальці. У чым розніца паміж крэдытам на навучанне і грантам? Які фактар не ўплывае на крэдытаздольнасць? Чым дэбетавая картка адрозніваецца ад падарункавай? Чым займаецца Нацбанк? І ў фінал гульні праходзіць каманда Ленінскага раёна.

**«Такія эканамічна-спартыўныя спаборніцтвы скіраваны перш за ўсё на павышэнне фінансавай граматнасці моладзі. Без гэтых ведаў сёння нікуды».**

Цяпер Партызанскі раён супраць Савецкага — «Германія» супраць «Бразіліі». Выдатны выбар краін. Але што адбудзецца на справе? І вось мы бачым адказ — гэта сапраўдная «разня» па пенальці: «Германія» перамагае «Бразілію» з лікам 5:3. Гульні ідуць адна за адной. Такога хуткага футбола яшчэ ніхто не бачыў! У гарадскі фінал прайшлі зборныя Фрунзенскага і Ленінскага раёнаў.

Капітан каманды гімназіі №30 Фрунзенскага раёна дзевяцікласнік Аляксандр Кісялёў ужо не першы раз гуляе ў фінансавы футбол: яго навучальная ўстанова два гады таму, калі спаборніцтвы праводзіліся ў першы раз, стала пераможцай Мінска па «Фінансавым футболе».

— У нашай школе спецыяльнага эканамічнага факультатыву няма, — адзначае капітан. — Але мы рыхтаваліся да спаборніцтваў сур'ёзна: збіраліся камандай разам па некалькі разоў на тыдзень, шукалі пытанні і дадатковую інфармацыю.

«Фінансавы футбол» праводзіцца Нацбанкам Беларусі сумесна з РГА «БРСМ» ужо трэці год. Другі сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Юлія ЗЯНЬКЕВІЧ адзначыла: «Такія эканамічна-спартыўныя спаборніцтвы скіраваны перш за ўсё на павышэнне фінансавай граматнасці моладзі. Без гэтых ведаў сёння нікуды. Напрыклад, зараз паўсюль людзі карыстаюцца банкаўскімі карткамі. Уводзяцца яны і для школ. А ў форме гульні старшакласнікі могуць у забаўляльнай форме вывучыць элементарныя эканамічныя тэрміны, каб пасля ўмела распараджацца сваімі фінансамі».

**Кацярына РАДЗЮК.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**ДАВЕДКА**

**«Фінансавы футбол» — не беларускае ноу-хау. Гульню прыдумаў афіцыйны партнёр ФІФА кампанія VISA, аўтар ініцыятыў па павышэнні фінансавай граматнасці сярод моладзі па ўсім свеце. Беларуская версія гульні даступная для самастойнага навучання: у ёй прадугледжаны чатыры модулі з практыкаваннямі і тэстамі. Праверыць фінансавую граматнасць можна тут: www.by.financialfootball.com.**

Вучыцца гуляючы



# ЗРАБІЦЬ З РОБАТА... СУМАІСТА

**Яшчэ колькі гадоў таму буйныя фестывалі робатаў выклікалі вялізны ажыятаж: пра спаборніцтвы па робатафутболе, робатабарацьбе і іншых дысцыплінах у абавязковым парадку распавядалі самыя вядомыя сусветныя СМІ. Цяпер жа такімі мерапрыемствамі нікога не здзівіць: сфера крочыць наперад і становіцца паўсядзённай. Для беларусаў жа ўсё толькі пачынаецца, і першыя спаборніцтвы робатаў збіраюць натоўпы аматараў гэтага незвычайнага захаплення. Адзін з такіх турніраў прайшоў днямі ў мінскай гімназіі №50. На дзіцячых спаборніцтвах па робатасумо патрапілі і нашы карэспандэнты.**

Гэта ўжо другі адкрыты гарадскі турнір для дзяцей па робататэхніцы. Папярэдні адбыўся ўвесну і быў прымеркаваны да чэмпіянату свету па хакеі, што праходзіў у беларускай сталіцы. Гэтым была абумоўлена і асноўная дысцыпліна веснавых спаборніцтваў — робатахакей. Цяпер жа турнір «прывязалі» да фестывалю японскай культуры «Японская восень у Беларусі 2014» і дысцыпліну выбралі адпаведную — робатасумо. Арганізоўвалі яго грамадскае аб'яднанне ўсходняй культуры і традыцый «Хагакурэ», рэпетыцыйны цэнтр «100 балаў» і адзін з заснавальнікаў кампаніі «EPAM Systems» Леанід Лознер.

— Галоўная мэта правядзення турніру — папулярызацыя робататэхнікі ў Беларусі, — распавёў карэспандэнту «ЧЗ» адзін з арганізатараў **Яўген ЛІВЯНТ**. — Мы хочам, каб робататэхнікай у Беларусі займалася больш людзей. Такое мерапрыемства — просты і цікавы шлях да папулярызацыі. Аб пэўных поспехах можна казаць і зараз: год таму робататэхнікай у сталіцы займалася 100-150 чалавек, зараз размова ідзе ўжо пра лічбы ад 500 да 1000. Увогуле ў нашых планах кожны вучэбны год праводзіць па тры турніры: асенні, зімовы і вясенні. Хутчэй за ўсё, у наступны раз сустрэнемся якраз зімой.

Што ж уяўляе з сябе робатасумо? Калі вам даводзілася бачыць гэты від барацьбы на свае вочы, то адрозненняў з робатаспортам няшмат. Круглая пляцоўка для спаборніцтваў (па-японску — дахё) дыяметрам адзін метр з дзвюма рысамі, якімі адзначаны стартавыя пазіцыі электронных барацьбітоў. Раўнд доўжыцца 30 секунд. Перамагае той, хто здолее хаця б часткова выштурхнуць саперніка за межы круга. Бой ідзе да двух перамог. Максімальная колькасць раўндаў — тры.

Хлопцы з каманды «Гермес» — Ілья МАРКЕВІЧ, Алег АЗЕМША і Дзяніс ТАМАШЭВІЧ пачалі займацца робататэхнікай два гады таму ў рэпетыцыйным цэнтры. Цяпер ім па 14, і яны прыехалі на спаборніцтвы выключна для таго, каб перамагчы. Усе хлопцы збіраюцца працаваць у сферы IT.

— Самае цікавае ў стварэнні робата — праграміраванне, — кажа Алег. — Хочацца, каб усё працавала, і, калі тое, што ты першапачаткова задумаў, атрымліваецца, гэта сапраўдная радасць.

— Зборка аднаго «сумаіста» займае прыкладна шэсць гадзін, — дадае Дзяніс, — але ўсё залежыць ад складанасці. Вядома ж, на спаборніцтвы мы выставілі складанага, моцнага робата.

Дарэчы, слова «робат» у гэтым выпадку зусім не перабольшанне. Электронныя сумаісты ўзброены рознымі датчыкамі, якія ўплываюць на выкананне алгарытму, закладзенага стваральнікам: руху, дакранання, адлегласці, святла. Ад таго, як «трэнер» падрыхтуе свайго байца ў плане штучнага інтэлекту, галоўным чынам, і залежыць поспех.

— Я лічу, што гэта і ёсць самая сучасная інжынерная адукацыя, — каментуе Яўген Лівянт. — Асновы праграмавання, асновы механікі... Думаю, калі б у нас у такім фармаце праходзіла частка ўрокаў працоўнага навучання, плёну ад іх было б значна больш.

Целы «сумаістаў» пластыкавыя, сабраныя з дэталяў спецыяльнага набору канструктара LEGO. Максімальны памер — 25 на 25 сантыметраў. Вага не павінна перавышаць аднаго кілаграма. Усе паказчыкі замяраюцца перад кожным паядынкам. Калі нешта не адпавядае рэгламенту, стваральнікам даюцца дзве хвіліны на перапрацоўку. Дарэчы, узрост юных інжынераў таксама абмежаваны: удзел у конкурсе не маглі прыняць тыя, хто нарадзіўся раней за 1 студзеня 1998 года.

Некаторыя баі вылучаліся пэўнай жорсткасцю: напрыклад, у аднаго з робатаў-удзельнікаў падчас сутычкі зляцелі гусеніцы. Каманда аператыўна вяртае ўсе дэталі на месца, каб пазмагацца за перамогу ў наступным раўндзе. Дыстанцыйна кіраваць робатам падчас бойкі забаронена: усе адпаведныя інтэрфейсы бартавога камп'ютара павінны быць адключаны.



Акрамя робатасумо, праводзіліся спаборніцтвы па яшчэ дзвюх дысцыплінах. У творчым конкурсе стваральнікам прапаноўвалася прадставіць робата, які дапамагаў бы людзям у штодзённым жыцці. Асабліва цаніліся электронныя памочнікі, якія ўмеюць нешта такое, што не пад сілу чалавеку. У трэцяй дысцыпліне ацэньваліся прысвечаныя робатам хоку (традыцыйныя японскія вершаваныя трохрадкоўі). Наведвальнікі таксама маглі пазнаёміцца з невялікай экспазіцыяй, што дэманстравала гісторыю развіцця робататэхнікі і самыя цікавыя мадэлі робатаў, створаныя ў Беларусі.

**«Я лічу, што гэта і ёсць самая сучасная інжынерная адукацыя, — каментуе Яўген Лівянт. — Думаю, калі б у нас у такім фармаце праходзіла частка ўрокаў працоўнага навучання, плёну ад іх было б значна больш».**

Не менш за спаборніцтвы ўразіла колькасць гледачоў. У актавай зале гімназіі не хапіла месца ўсім ахвотным паназіраць за цырымоніяй адкрыцця. А вакол робатаў, што біліся на імправізаваных дахё, сабраўся сапраўдны натоўп. Арганізатары адзначалі, што мерапрыемства перарасло маштаб школьнай рэкрэацыі.

**Інжынер Анатоль БАРЭЙКА** са Жлобіна прыйшоў на спаборніцтвы ў якасці гледача з шасцігадовым унукам Раманам:

— Пра спаборніцтвы праз інтэрнэт даведаўся зяць. Рома гэтым цікавіцца, таму сёння мы прыйшлі паназіраць за турнірам у якасці балельшчыкаў. Ведаеце, нават я зацікавіўся, калі ўбачыў, якія рэчы можна зрабіць са звычайнага канструктара. Шкада, што сам часам не разумею прынцыпу дзеяння апаратаў, але гэтым яны і інтрыгуюць.

Цікава, што пераможцам адразу ў дзвюх дысцыплінах (сумо і творчы конкурс) стаў самы малады ўдзельнік — Ян Францкевіч. Хлопцу ўсяго сем гадоў! Менавіта яго робаты аказаліся лепшымі за астатніх на спаборніцтвах. А ў конкурсе хоку перамогу святкаваў Павел Аземта.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

*Важацкі хлеб*

# ПАБЫВАЦЬ «У БОГА ЗА ПАЗУХАЙ»

## і павучыцца ў дзяцей галоўнаму



Піраты на захопленым караблі.

**Вы хацелі б папрацаваць беларускамоўнай важатай? Навучыцца хутка класці дзяцей спаць? А паначаваць тыдзень у... царкве? Гэтыя і іншыя прыгоды мне давялося перажыць сёлета ў праваслаўным дзіцячым лагеры «Святая Русь» пад Нясвіжам пасля таго, як далучылася да валанцёрскага праекта «Спадчына Радзівілаў». На трэці дзень наведвання Нясвіжа наша каманда завітала ў Свята-Георгіеўскі храм. Падчас сняданку адзін са святароў — дыякан айцец Павел ФОКІН — сказаў:**

— Мы арганізоўваем лагер для праваслаўных дзетак. Усе, хто жадае дапамагчы нам, падыдзіце, калі ласка.

Я так і зрабіла. Акрамя мяне, да айца Паўла падышоў і Аляксей КУЗАЎКА. Хлопец, які за два дні «Спадчыны Радзівілаў» правёў дзясятка паўтара гульняў для валанцёраў. Ён вылучаўся сярод астатніх. Хаця б таму, што прыехаў не адзін, а з сабакам — аўчаркай Стайлам. Айцец Павел радасна пагадзіўся прыняць нас.

...Калі мы прыехалі да Свята-Траецкага храма ў вёсцы Салтанаўшчына, усіх удзельнікаў лагера ўжо рассялілі і свабодных месцаў не аказалася. Айцец Алег (АБРАМОВІЧ) блаславіў, і айцец Павел, Аляксей і я размясціліся... у царкве.

Спалі мы на клірасе — балконе на другім ярусе будынка, дзе спявае хор. А ўнізе спала выкладчык выцінанкі. Яна таксама не распраналася, заўжды спала з пакрытаю галавою, у шаліку. Спачатку здавалася, што ў храме спаць страшна і няўтульна. Але пасля першай ночы мы ўчатырох аднадушна пагадзіліся: «Як у Бога за пазухай».

Усяго ў лагеры сабралася каля 80 дзяцей прыкладна ад 8 да 15 гадоў, у асноўным з Нясвіжа і Мінска. Таксама былі на аздараўленні хлопчыкі і дзяўчынкі з Луганскай вобласці Украіны. Як вядома, дзяцей трэба ўвесь час нечым займаць. Якраз над апошнім і працавалі мы ўтрох — айцец Павел, Аляксей і я.

Напрыклад, ёсць выдатны квест на знаёмствы. Бярэцца покрыва. Яго расцягваюць двое вядучых. З аднаго боку ад коўдры садзіцца на кукішкі першая каманда, з іншага — другая. Кожная выстаўляе па адным чалавеку (яго саджаюць наперад). Імправізаваны заслон на лік «Тры!» апускаецца, і тыя двое павінны назваць імя чалавека насупраць. Хто першы назаве — той і выйграў. Той, хто прайграў, пераходзіць у каманду сапернікаў.

На тэрыторыі лагера, акрамя жылых домікаў, знаходзіўся карабель, збіты з бярвенняў. У ім былі і прыступкі, і тунэлі, і нават стол для бадмінтона. Такі своеасаблівы спартыўны міні-комплекс. Мы вырашылі выкарыстаць яго і арганізаваць для дзяцей вечар піратаў. Спачатку дзве каманды (хлопчыкі і дзяўчынкі) бегалі па ўсім лагеры ў пошуках скарбу — штосьці накшталт «Форд-баярда». У выніку дзеці прыносілі нам канчатковы пароль, і мы ладзілі новы віток спаборніцтваў. Кожная каманда праходзіла праз карабель з перашкодамі. Мы і аблівалі дзяцей вадой, і танцавалі, і білiся падушкамі, і пілі ваду з вядзёр. У выніку нашы юныя піраты атрымалі ключы ад самага сапраўднага куфра, у якім быў схаваны салодкі скарб.

Пазней — ужо ў спартландыі — мы адмовіліся ад усім вядомых эстафет. А замест гэтага кідалі ўласны абутак ў кардонкі, елі манга на хуткасць, круцілі муміі з туалетнай паперы і гулялі ў чахарду. Акрамя таго, дзяцей арганізавана вазілі ў басейн, на возера, на экскурсію ў Свята-Елісееўскі мужчынскі манастыр і пасёлак Мір, мы ўдзельнічалі ў хрэсным ходзе.

За дні лагера — майго важацкага «старту» — самі сабой сфарміраваліся тры асноўныя высновы.

У важатага павінна быць свая «цікавінка». Напрыклад, я ўсю змену размаўляла па-беларуску. Лагічна, што часцей за ўсё дзеці пыталіся:

— Няўжо заўсёды так, нават дома?

— Вядома ж, — адказвала. — Я беларуска і таму кажу па-беларуску. А вы?

Да канца змены некаторыя ўжо таксама спрабавалі размаўляць са мной па-беларуску, што кранала і радавала.

Галоўнае — быць з дзецьмі. Не толькі праводзіць з імі конкурсы, а ўдзельнічаць ва ўсім, што яны робяць. Гуляць у валейбол, піянербол, спяваць песні ўвечары каля вогнішча, у басейне плёскацца ў «жабніку», разам вырабляць падарункі для маці, спаць побач днём, хадзіць за руку на экскурсіях, стаяць побач падчас малітвы ў храме, заплятаць адна адной валасы, усім разам абліваецца вадой у спёку. А яшчэ мы чыталі на ноч казкі. Я — малодшым дзяўчынкам, айцец Павел — малодшым хлопчыкам. У першы дзень мы чыталі арыгінальную, з хрысціянскімі ноткамі «Русалачку» Ганса Хрысціяна Андэрсана (дзяўчынкі самі папрасілі менавіта яе). Дзесьці пасярэдзіне казкі — хвілін праз 15 чытання — усе заснулі. І надалей нават самыя непаслухмяныя змаўкалі пад наша чытанне і ўціхамірваліся. Пад канец злёту дзяўчынкі самі бралі мяне за руку і прасілі пачытаць ім натач.

І яшчэ. Вельмі важна, якія важатыя ёсць у лагеры, акрамя цябе. У нас з Аляксеем і айцом Паўлам атрымалася сапраўдная каманда. Нас нават называлі «Змеем Гарынычам»: адна галава добра, а тры — сапраўдная сіла. І дзецям весялосць.

...Калі мяне спыталі, што самае галоўнае было ў лагеры, адказала: «Самі дзеці». Мне пашчасціла, таму што больш добрых, паслухмяных дзетак я яшчэ не бачыла. За час злёту я вучылася ў іх шчырай сардэчнай цеплыні, якой так не хапае часам дарослым. Дзеці ў гэтым — лепшыя настаўнікі.

**Вераніка ПУСТАВІТ, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ. Фота аўтара.**



У храме.



Якіх толькі перашкод не было на шляху каманд да прыза!

*ГАЙДа з намі!*

# ЛЭДЗІ З ХАРАКТАРАМ,

## або Нашчадкі «Сясцёр вогнішча»

**Калі дзяўчат-гайдаў просяць патлумачыць, што азначае загадкавае слова «гайд», яны проста ў лоб пытаюць: «Скаўтаў ведаеце? Уся розніца паміж намі, што мы — дзяўчаты».**

### АД «ПТУШКІ» ДА «РЭЙНДЖАРА»

У пачатку XX стагоддзя скаўтынг стаў настолькі папулярным, што дзяўчаты таксама захацелі далучыцца да руху. Спецыяльна для юных лэдзі была створана праграма пад назвай «гайдынг» — ад англійскага «гід, праваднік». Афіцыйна гайды ў Беларусі з'явіліся толькі ў 1993 годзе, хаця ў 20-я гады XX стагоддзя ў Вілейскай гімназіі існаваў атрад «Сёстры вогнішча».



— Гайдынг разлічаны на развіццё дзяўчат, іх адаптацыю ў грамадстве, — распавядае **кіраўнік арганізацыі «Асацыяцыя беларускіх гайдаў» Вольга ВІХАРАВА.** — Існуюць тры ўзроставыя праграмы: ад 7 да 10 гадоў — гэта «птушкі», ад 11 да 14 — «гайды», і ад 15 да 18 — «рэйнджары». Калі самыя маладыя спазнаюць усё праз гульню, то старэйшыя ўжо самі прыдумляюць гульні і дапамагаюць арганізаваць сустрэчу ці мерапрыемства. Дзяўчаты збіраюцца ў атрады па 10—12 чалавек. Атрадам умоўна кіруе лідар — гэта старэйшая сястра гайдаў, да якой можна звярнуцца па параду. У нас дарослыя не кіруюць дзецьмі, а супрацоўнічаюць з імі. Формы супрацоўніцтва самыя розныя — трэнінгі, штотыднёвыя сустрэчы, паходы, акцыі і святы.

### НА ЧАЯВАННІ Ў КАРАЛЕВЫ

Вольга прызнаецца: самая доўгачаканая падзея ў жыцці дзяўчат-гайдаў — гэта летні лагер. Менавіта так некалі, трапіўшы да гайдаў на летніх канікулах, яна сама захацела далучыцца да руху і прайшла шлях ад пачаткоўца да кіраўніка арганізацыі. Распавяла пра сёлетні міжнародны палатачны лагер «Wonderland», які праводзіўся на спартыўна-аздараўленчай базе «Галактыка» пад Ракавам, **рэйнджар Алена СВІРЫДОВІЧ.** Дзяўчынцы 14 гадоў. З гайдынгам яна пазнаёмілася яшчэ ў трэцім класе і з 9 гадоў прымае ўдзел у летніках.



— Тут добра: ты як быццам бы і пад наглядам, але адчуваеш сябе вольнай, — адразу выдае Алена. — Сёлетні летнік быў прысвечаны твору Льюіса Кэрала «Аліса ў краіне цудаў» і ўся яго праграма была тэматычная. Напрыклад, спартыўныя спаборніцтвы называліся «Кракет у Каралевы», а каманды-патрулі мелі казачныя назвы: «Вар'яцкія капялюшнікі», «Чашырскія каты», «Канюшына» і «Чароўныя трусы».

Кожны патруль ладзіў цікавую прэзентацыю: напрыклад, «Капялюшнікі» зрабілі з коўдрачак конус капелюша, адкуль вылазілі дзяўчаты. На адзін дзень гайды сталі рэжысёрамі і ставілі па матывах «Алісы» стужку ў розных жанрах: баявік, камедыя, меладрама.

— Яшчэ мы вельмі стараннa рыхтаваліся да чаявання ў Каралевы — рабілі касцюмы і падарункі для яе Вялікасці. На майстар-класе па звязванні... бярвёнаў навучыліся рабіць лаўкі і адну такую змайстравалі для Каралевы. Дарэчы, вось яна, — паказвае на Вольгу Алена.

### КАЛІ ЗАХОДЗІЛА СОНЦА...

Амаль усе ночы гайды не спалі: як толькі заходзіла сонца, у лагеры пачыналіся цікавыя гульні.

— Самая любімая забаўка гайдаў — «Сцежка страху», — усміхаецца Алена. — Гэта начная прагулка з «монстрамі». Раней я проста назірала і пужалася, а сёлета сама стала ўдзельніцай. Адусюль на сцежку, па якой прагульваліся гайды, вылазілі «монстры»... Мы ўсе так крычалі, што з дзіцячага лагера прыбегла ахова: думалі, кагосьці забіваюць».

— Дзецям толькі дай павесяліцца, а наша вясёлая гульня прывучае не пужацца цемры і не панікаваць, калі ты заблукаў, — тлумачыць Вольга.

Кожны вечар гайды збіраліся разам каля вялікага вогнішча, дзе спявалі песні і пяклі скаўцкі хлеб. «У нас было самае звычайнае цеста, якое мы намотвалі на галінку і смажылі, — распавядае Алена. — А пасля дадавалі да яго згушчонку, і атрымлівалася такое смакоцце, што не перадаць словамі!».

Лідары лагера кожны дзень выдумлялі для сваіх выхаванцаў што-небудзь новенькае. Так, гайдаў адправілі ў аднадзённы паходквест у Ракаў. І вядома ж, не з пустымі рукамі, а з цэлым спісам заданняў. «Праваднікі» павінны былі даведацца легенду аб стварэнні Ракава ад мясцовых і зрабіць пяць фотаздымкаў з ракаўчанамі — з чым яны справіліся на «выдатна». Напрыканцы лагера ўсе гайды шукалі скарб: пакуль «праваднікі» гойсалі па сцежках, іх лідары ламалі галаву: як жа схаваць так, каб не адразу знайшлі?

### ГАЛОЎНЫ ЗАПАВЕТ ГАЙДА

У лагеры было даволі многа дзяўчат, якія толькі знаёміліся з гайдынгам. У «Краіну цудаў» трапілі 50 гайдаў, сярод якіх былі і госці з Англіі.

Падчас лагера «Wonderland» праводзілася гульня «Таемны сябар»: дзеці выцягвалі паперкі з іменем і цэлы дзень неўпрыкмет рабілі свайму сябру падарункі альбо казалі кампліменты. Алене «выпала» англічанка. Тая падарыла сваёй сяброўцы манетку, якую брытанцы выпусцілі да 100-годдзя гайдынгу. А калі я папрасіла дзяўчынку назваць запавет гайда, якога яна стараецца прытрымлівацца перш за ўсё, рэйнджар прамовіла «Гайд — сябар усім людзям і сястра ўсім гайдам».

«Праз чатыры гады я стану лідарам», — упэўнена кажа Алена. Рух актыўных дзяўчат дапамог ёй стаць самастойнай, паверыць у сябе і пачаць рэалізоўвацца. Як прызнаецца суразмоўца, ёй падабаецца гайдынг: гэта выдатны спосаб для самаразвіцця і магчымасць дапамагчы іншым людзям. Гайды — маленькія жанчыны, якія мяняюць свет і ўмеюць добра павесяліцца.

**ДАВЕДКА**

***Асацыяцыя беларускіх гайдаў — непалітычная, нерэлігійная арганізацыя, удзельнічаць у якой могуць дзяўчаты і жанчыны. З 2002 года яна з'яўляецца паўнапраўным членам Сусветнай асацыяцыі дзяўчат-гайдаў і дзяўчат-скаўтаў. Уваходзіць у рэестр дзіцячых арганізацый, якія маюць падтрымку ад дзяржавы. Грашовы ўнёсак у год складае 20 тысяч рублёў.***

**Кацярына РАДЗЮК. Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
23 10 2014 г.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 450/С-24281 (назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), наименование – водогрейка), площадью 57.5 кв.м, покрытие асфальтобетонное, забор, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295Д |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425450100001008028, площадью 0,8653 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий водогрейки) по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295Д. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 41, площадь – 0,8543 га, земельный участок, находящийся в прибрежной полосе водного объекта, код – 42, площадью 0,0110 га. |
| **Начальная цена продажи** | 157 255 560 (сто пятьдесят семь миллионов двести пятьдесят пять тысяч пятьсот шестьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 15 725 556 (пятнадцать миллионов семьсот двадцать пять тысяч пятьсот пятьдесят шесть) белорусских рублей |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 450/С-24295 (назначение – здание специализированное растениеводства, наименование – теплица), площадью 1417,5 кв.м Составные части и принадлежности: служебные помещения, покрытие асфальтобетонное, забор, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295Е |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425450100001008030, площадью 0,3447 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий водогрейки) по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295Е. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 41, площадь – 0,3447 га |
| **Начальная цена продажи** | 133 349 580 (сто тридцать три миллиона триста сорок девять тысяч пятьсот восемьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 13 334 958 (тринадцать миллионов триста тридцать четыре тысячи девятьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 450/С-24282 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-бытового корпуса), площадью 5480,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295. Составные части и принадлежности: два подвала, СТО тракторов, склад, вход в подвал, загрузочный люк, четыре забора, двое ворот, водопроводная сеть, колодец, канализационная сеть, электрическая сеть, колодец, покрытие |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425450100001008082, площадью 0,8172 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания административно-бытового корпуса) по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадь – 0,8172 га |
| **Начальная цена продажи** | 5 464 365 480 (пять миллиардов четыреста шестьдесят четыре миллиона триста шестьдесят пять тысяч четыреста восемьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 546 436 548 (пятьсот сорок шесть миллионов четыреста тридцать шесть тысяч пятьсот сорок восемь) белорусских рублей |
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 450/С-24302 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание складов и кузни), площадью 561,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295Г. Составные части и принадлежности: пристройка, линия электропередачи 0,4 кв., покрытие, две подпорных стенки, ограждение площадки склада, четверо ворот |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425450100001008029, площадью 0,5038 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания складов и кузни) по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 295. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадь – 0,5038 га |
| **Начальная цена продажи** | 384 170 220 (триста восемьдесят четыре миллиона сто семьдесят тысяч двести двадцать) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 38 417 022 (тридцать восемь миллионов четыреста семнадцать тысяч двадцать два) белорусских рубля |
| **Продавец** | Ликвидационная комиссия ДП «Слонимская сельхозтехника» ГУП «Облсельхозтехника», 231800, Республика Беларусь, Гродненская область, г. Слоним, ул. Красноармейская, 295 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 25 ноября 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять объект с торгов в любое время до момента продажи без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Сумма затрат на организацию и проведение аукциона, подлежащая возмещению победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) составит примерно 5 000 000 рублей.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник–четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 19 ноября 2014 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок:**
**41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:
## 03 ноября 2014 г. в 11.00 состоятся повторные открытые аукционные торги по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйск АТЭП» (продавец торгов) в составе Лота № 1:

| | |
|---|---|
| Лот № 1 (предмет торгов): Кап. строение с инв. ном. 710/С-51596 (площадка для подготовки водителей автотранспортных средств(автодром)), пл. 4416,0 кв.м; кап. строение с инв. ном. 710/С-51597 (забор кирпичный), пл. 540,0 кв.м | |
| **Адрес предмета торгов:** | г. Бобруйск, Могилевская обл., ул. Орджоникидзе, 100к |
| **Продавец (право собственности)** | Открытое акционерное общество «БобруйскАТЭП», УНП 700071974, ОКПО 058935867000 213830, г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 100, р/с 3012259180015(BYB), 3012259185052(USD,EUR) в РКЦ № 24 в г. Бобруйск филиала ОАО «Белагропромбанк» Могилевское областное управление |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» код 153001369) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Информация о земельном участке** | Предмет торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002152, площадь – 0,4852 га, по адресу: ул. Орджоникидзе,100к, г. Бобруйск, правовой режим – право постоянного пользования |
| **Начальная цена предмета торгов** | 701 083 500 рублей без учета НДС, размер задатка – 45 000 000 рублей, шаг аукциона – 5% |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»: р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» код 153001369, г. Минск, пр. Машерова, 80, УНП 102353509 |
| **Характеристика предмета торгов** | |
| **площадка для подготовки водителей автотранспортных средств(автодром**), пл. 4416 кв.м, 1987 года ввода в экспл., составные части: покрытие – асфальтобетон, основание – щебень; **забор кирпичный сплошной**, 1987 года ввода в экспл., длина 219 м, составные части: столбы – кирпичные, цоколь – бетонный | |
| **Условия продажи** | При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20% |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Срок и условия оплаты за предмет торгов** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи, возможна рассрочка платежа |
| **Срок подачи документов для участия в торгах, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | по 28 октября 2014 г. включительно до 17.00 |
| **Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов. | |
| **Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 26 сентября 2014 г. | |

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710 50 85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже прав заключения договоров аренды земельных участков в г. Мосты

**Аукцион состоится в 12.00 4 ноября 2014 г. в г. Мосты, пл. Ленина, 3.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 29 октября 2014 г. до 15.00.**
**Телефон для справок:**
**41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация: www.ino.by**

| Номер лота | 1 |
|---|---|
| **Адрес земельного участка, кадастровый номер** | а.г. Гудевичи, 424081301601000242 |
| **Целевое назначение земельного участка** | Установка и обслуживание временного торгового павильона |
| **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества** | 1-16-03 размещение объектов розничной торговли |
| **Право на земельный участок, срок заключения договора аренды** | Аренда сроком на 10 лет |
| **Площадь, га** | 0,0220 |
| **Форма участка** | Прямоугольная |
| **Расположение участка в массиве застройки** | Угловой |
| **Инженерная инфраструктура** | Имеется возможность подключения к сетям электро-, газо-, и водоснабжения, асфальтированный подъезд |
| **Наименование ограничений в праве** | 0,0220 га – водоохранная зона водных объектов |
| **Начальная цена земельного участка, руб.** | 105 050 (сто пять тысяч пятьдесят) белорусских рублей |
| **Задаток, руб.** | 10 505 (десять тысяч пятьсот пять) белорусских рублей |
| **Дополнительное условие** | возместить затраты на изготовление землеустроительной документации и государственную регистрацию земельного участка в размер 12 186 532 рубля |
| Условия проведения аукциона в части продажи права аренды земельных участков. | |

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона (изъявившему желание на приобретение Лота по начальной цене, увеличенной на 5%):

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона (затраты на организацию и проведение аукциона ориентировочно составят 5 000 000 рублей);

- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией возникновения права на этот участок в Мостовское бюро Волковысского филиала республиканского унитарного предприятия «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

-получить в установленном порядке разрешение Мостовского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ, архитектурно-планировочное задание, технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта в течение 1 месяца со дня государственной регистрации земельного участка;

- разработать проект на строительство объекта, провести государственную экспертизу проекта и утвердить его в установленном порядке в срок, не превышающий 2 лет со дня получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ;

- приступить к строительно-монтажным работам на предоставленном земельном участке в течение шести месяцев со дня утверждения проектной документации и завершить строительство объекта в сроки, определенные строительным проектом.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

<u>Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:</u>

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

- юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копии учредительных документов

- индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

- юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе).

<u>При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:</u>

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.09.2014 г.**

*Номер р/с для перечисления задатка для участия в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и по продаже права аренды земельных участков – р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.*

Вуснамі іншаземца

# ЛЮБІМАЕ СЛОВА — «ДОБРАНЬКА»

**Японка Сіёры КІЁСАВА, аспірантка Цукубскага ўніверсітэта, не толькі за некалькі гадоў вывучыла нашу мову, але і пачала на радзіме праводзіць беларускамоўныя курсы для суайчыннікаў.**



— Беларускай мовай я зацікавілася чатыры гады таму ў Японіі, — пачынае размову Сіёры, якая зараз праходзіць у Беларускім дзяржаўным універсітэце трохмесячную стажыроўку. — Я чытала кнігу з агульнымі звесткамі пра Беларусь. І ў ёй было напісана, што ў гэтай краіне гарадскія жыхары амаль не размаўляюць на роднай мове. Хаця пасля распаду Савецкага Саюза ў большасці рэспублік людзі імкнуліся перайсці менавіта на нацыянальную мову. Гэтае пытанне мяне вельмі зацікавіла, а мой навуковы кіраўнік параіў напісаць аб гэтым магістарскую дысертацыю. Так атрымалася, што два гады таму наш універсітэт падпісаў дагавор з БДУ і ў мяне з'явілася магчымасць пастажыравацца ў вашай краіне. Тады я ўпершыню аказалася ў Мінску і пачала вывучаць мову. Зараз даследую моўную палітыку і моўную сітуацыю ў Беларусі.

***— Цікава, а што блізкія думаюць пра твой навуковы інтарэс?***

— Бацькі, сябры, як і большасць японцаў, не ведалі пра існаванне Беларусі, і мае дзядулі, бабулі лічылі, што я стажыруюся ў Расіі. Часам нават пыталіся: «Ну як табе ў Расіі?». Мне прыходзілася іх папраўляць і тлумачыць, што я знаходжуся ў іншай краіне.

***— Для замежніка ты выдатна размаўляеш па-беларуску. Але мне здаецца, што японцам будзе складана нават проста паўтараць нашы словы...***




Для зручнасці Сіёры змясціла японскі алфавіт у падручніку па беларускай мове.

— Так, бо японская вельмі адрозніваецца ад індаеўрапейскіх моў. Таму японцам, па вялікім рахунку, цяжка вывучаць не толькі беларускую, але і ўсе славянскія мовы. Руская таксама не выключэнне. Дарэчы, розніцу паміж беларускай і рускай мовамі я ўжо адчуваю, аднак бачу ў іх агульныя рысы.

***— Тым не менш ты ўжо ладзіш у Токіа бясплатныя беларускамоўныя курсы.***

— У Японіі беларускую мову яшчэ ніхто не выкладае, і мы нават не маем японска-беларускага слоўніка. Праўда, пасля леташняй стажыроўкі ў Мінску я разам з беларускай знаёмай, якая жыве ў нашай краіне, арганізавала моўныя курсы для японцаў. Спачатку прыходзілі людзі, якіх хапала толькі на адзін раз. Яны разумелі, што гэта не для іх, і больш не вярталіся. Але засталося каля дзесяці японцаў, якія пастаянна прыходзяць на заняткі.

***— У цябе ёсць любімае беларускае слова?***

— Слова «добранька». Нават калі людзі па тэлефоне размаўляюць па-руску, яны любяць казаць гэтае слова. Мне здаецца, што яно вельмі натуральнае, і яно перадаецца кожнаму беларусу на нейкім генетычным узроўні.

***— Табе нехта з беларусаў казаў, што ты лепш за іх валодаеш мовай?***

— Казалі. Спачатку мяне гэта здзіўляла, а пасля я зразумела, што руская мова распаўсюджана тут даўно. Калі кантактую, напрыклад, з прадаўцамі ў краме, часам прыходзіцца пераходзіць на рускую мову. Але ёсць кнігарня, дзе працуюць беларускамоўныя прадаўцы, з якімі я з асалодай магу пагутарыць пра кнігі. Я ўсё ж такі займаюся навукай, а таму мовазнаўчыя артыкулы мяне цікавяць зараз больш, чым мастацкая літаратура. Нягледзячы на гэта, для навуковай канферэнцыі я падрыхтавала даклад «Пераклады беларускай літаратуры на японскую мову». Дарэчы, усе пераклады беларускіх пісьменнікаў на японскую мовую раней рабіліся праз рускую мову, а гэта, безумоўна, дрэнна. У Японіі зараз працуе Го Кашына, адзіны даследчык беларускай літаратуры, які перакладаў на японскую Рыгора Барадулін, Уладзіміра Караткевіча і Андрэя Федарэнку.

***— Цікава, а што новае для цябе адкрыла Беларусь?***

— Мне здаецца, беларусы вельмі падобныя да японцаў. Яны такія ж сціплыя, як і мы, але не такія адкрытыя, як украінцы ці рускія. Мне, дарэчы, не было складана адаптавацца да мясцовага ладу жыцця.

***— А ты не хочаш застацца на пэўны час і папрацаваць у нашай краіне?***

— Мне вельмі падабаецца Беларусь. І калі б была падобная магчымасць, я не супраць. Але праблема ў тым, што заробак у выкладчыкаў, навукоўцаў тут сціплы. Жыць на гэтыя грошы складана. А я атрымліваю японскую стыпендыю і таму адчуваю сябе камфортна.

**Якаў ЖУРБІН.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

Welcome to Беларусь

## 10 ПРЫЧЫН ВУЧЫЦЦА Ў НАС

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт запусціў на YouTube-канале іміджавы ролік, скіраваны на прыцягненне замежных студэнтаў для навучання ў беларускіх ВНУ.**

Яго сюжэтную канву складаюць гісторыі студэнтаў-іншаземцаў, якія атрымліваюць у нашай краіне вышэйшую адукацыю. У трохвілінным відэа прыводзяцца дзесяць найбольш важных прычын, чаму трэба выбіраць для вучобы менавіта Беларусь. Мяркуецца, што ролік будзе распаўсюджвацца ў інтэрнэце, а таксама праз партнёрскія арганізацыі ў замежных краінах, якія займаюцца прыцягненнем замежных абітурыентаў у беларускія ВНУ.

Даны праект быў выкананы ў медыяцэнтры БДУ па заказе і пры падтрымцы Цэнтра міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ.

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у Беларусі зараз навучаюцца больш як 13 тысяч замежных грамадзян, з якіх каля 2,5 тысячы атрымліваюць адукацыю ў БДУ.

Майстар-клас

## ЧАКАЮЦЬ НА ЧАЙНАЙ ЦЫРЫМОНІІ

**Серыю майстар-класаў, прысвечаных кітайскай традыцыйнай культуры і мастацтву, праводзяць у навучальных установах Мінска і Мінскай вобласці выкладчыкі Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ.**

Яны знаёмяць школьнікаў і студэнтаў з тэхнікай выразання з паперы, каліграфіяй, аздараўленчай гімнастыкай тайцзіцюань, а таксама асаблівасцямі правядзення чайнай цырымоніі.

У школьнікаў і студэнтаў ёсць магчымасць самастойна зрабіць кітайскія сувеніры і паспрабаваць сябе ў ролі каліграфістаў. Акрамя таго, госці частуюць гаспадароў традыцыйнымі ўсходнімі стравамі і расказваюць пра спецыфіку іх прыгатавання.

А ты так можаш?

## НА КІТАЙСКАЙ, ВОБРАЗНА

**Рэспубліканскі конкурс мастацкага чытання на кітайскай мове ўпершыню пройдзе ў БДУ. Яго арганізатарам выступілі кафедра кітайскай філалогіі БДУ і Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі. Удзельнікамі творчых спаборніцтваў могуць стаць студэнты любых ВНУ.**

Чытальнікам трэба будзе прадэкламаваць класічныя мастацкія творы або творы ўласнага сачынення. У распараджэнні канкурсантаў будуць ад дзвюх да пяці хвілін. За гэты час ім давядзецца прадэманстраваць майстэрства выразнага чытання, а таксама акцёрскія і аратарскія здольнасці. Выступленне можа суправаджацца аўдыёвізуальнымі матэрыяламі.

Заяўкі на конкурс прымаюцца да 15 лістапада — на электронны адрас phyl@bsu.by і khmelnickiNN@bsu.by. Само мерапрыемства адбудзецца 25 лістапада на філалагічным факультэце БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «У МЯНЕ — БЕЛАРУСКАМОЎНЫ СВЕТАПОГЛЯД»

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Ці давялося пабываць у нашай краіне?***

— Так, у інтэрнэце пазнаёміўся з беларускім хлопцам, мы пасябравалі. У 2008 годзе ён запрасіў мяне да сябе ў Мінск на майскія святы. Я згадзіўся. Паездка спадабалася. Толькі калі вярнуўся дадому, усвядоміў, што так і не пачуў сапраўднай беларускай мовы. І тут якраз мае сябры з філфака сталі цікавіцца, як яна гучыць. Тады вырашыў, што вывучу мову самастойна.

**«Беларуская мова падалася мне адукаванай і прыгожай дзяўчынай, якая на балі стаіць сціпла недзе збоку, таму што ёй не хапае самаўпэўненасці».**

***— І якім чынам вучыў? Па падручніках?***

— Не, у першую чаргу пачаў шукаць інфармацыю ў сеціве. Я па адукацыі філолаг, настаўнік рускай мовы і літаратуры, але працую не зусім па спецыяльнасці — журналістам на партале навін у Саратаве. Якраз з сайтаў навін і пачаў вучыць мову. Ведаеце, ёсць такая функцыя на многіх сайтах — пераключыць мову. Вось я і чытаў навіны па-беларуску, а потым, калі нешта не разумеў, уключаў рускі пераклад. А яшчэ пачаў слухаць беларускае радыё ў інтэрнэце. Гэта дапамагала «адчуць» мову. Вельмі важна было знайсці суразмоўцу, каб папрактыкавацца. Пісаў беларусам у сацыяльных сетках, але большасць адказвала нешта накшталт «А зачем это тебе?» Напэўна, я быў для гэтых людзей як тая пальма ў Новасібірску. У выніку знайшоў чалавека, які працуе ў Мінску псіхолагам. Ён адшукаў кнігу «Гавары са мной па-беларуску», якая вельмі мне дапамагла. Ну і, вядома, размаўляў са мной у інтэрнэце, але зараз ён заняты, таму я зноў у пошуку. Суразмоўца патрэбны, бо самая вялікая цяжкасць у вывучэнні мовы для мяне — гэта правільна паставіць націскі. Я нядрэнна вывучыў лексіку, але часам не магу ёй скарыстацца, бо не ведаю, як тое ці іншае слова вымаўляецца.

***— Цябе здзівіла тое, што ў Беларусі мову так і не давялося пачуць?***

— Безумоўна. Беларуская мова падалася мне адукаванай і прыгожай дзяўчынай, якая на балі стаіць сціпла недзе збоку, таму што ёй не хапае самаўпэўненасці.

***— Ёсць у цябе якія-небудзь ідэі, як варта папулярызаваць мову?***

— Мне думаецца, што пачынаць трэба з банальнага, хаця б з літаратуры. Выдаваць больш кніг па-беларуску, прычым не падручнікаў, а таго, што сапраўды чытаюць людзі. Класікаў і тое, што завуць «папсой», ці «бульварным чытвом», — жаночыя раманы, дэтэктывы. Перакладаць кіно і пускаць яго ў пракат на мове, бо знайсці фільм па-беларуску вельмі цяжка, ведаю па ўласным досведзе. Тыя ж сайты навін: большасць з іх працуе на рускай мове — чаму б не рабіць гэта па-беларуску? Жывая мова гучыць толькі ў метро.

**«Мова — гэта не толькі сродак зносін, гэта цэлы светапогляд. І беларускамоўны светапогляд цалкам адпавядае майму. Узяць, напрыклад, беларускія назвы месяцаў — гэта ж проста казка!»**

***— Класічнай сусветнай літаратуры на мове сапраўды не хапае...***

— Гэта вельмі дрэнна. Хаця я знайшоў колькі кніг. Перачытаў усяго О'Генры па-беларуску. А навелу Цвейга «Амак» увогуле ўпершыню прачытаў менавіта на мове.

***— А беларускай літаратурай цікавішся?***

— Пакуль ведаю павярхоўна. З задавальненнем чытаў Васіля Быкава. А яшчэ ў нас на радыё «Сярэбраны дождж» быў праект, у межах якога прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў чыталі вершы сваіх паэтаў. Я выбраў Янку Купалу, так што хутка яго верш «Пакіньма напуста на лёс свой наракаць...» загучыць на саратаўскім радыё. А яшчэ я чытаў беларускія казкі. Пра іх можна размаўляць асобна, бо яны вельмі незвычайныя і цікавыя. Я назваў бы іх «гатычнымі».

***— Што для цябе беларуская мова цяпер?***

— Раскажу адну гісторыю. У сацыяльнай сетцы «Фэйсбук» асноўная маса людзей размаўляе па-англійску ці на іншых еўрапейскіх мовах. Аднойчы пабачыў беларускамоўную старонку і падумаў: «Вось і МАЯ мова». Толькі потым уцяміў, што яна не мая родная. Ведаеце, мова — гэта не толькі сродак зносін, гэта цэлы светапогляд. І беларускамоўны светапогляд цалкам адпавядае майму. Узяць, напрыклад, беларускія назвы месяцаў — гэта ж проста казка! А як правільна, што «любоў» і «каханне» — у беларускай мове розныя паняцці... Сваіх саратаўскіх сяброў я «падсадзіў» на слова «праца», мы «работай» увогуле больш не карыстаемся. Я сапраўды вельмі люблю Беларусь і беларускую мову, нават жывучы ў Расіі. На тое гэта і любоў, магчыма, бо адчуваеш, што гэта тваё — і ўсё.

***— Цікавішся чым-небудзь, акрамя беларускай мовы і культуры?***

— Я люблю плаваць (мая маці — трэнер па плаванні), люблю цягнікі і часта вандрую. Аб'ездзіў усю Расію, а яшчэ быў у Латвіі, Літве, Польшчы, Украіне, Чэхіі, Германіі, Аўстрыі, Фінляндыі, Даніі, Нарвегіі і Швецыі. Пішу апавяданні пра свае вандроўкі для сайтаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

***Калі ў вас ёсць час і жаданне дапамагчы Мікалаю з вывучэннем беларускай мовы, вы можаце звязацца з ім праз электронную пошту: nickolai.kolom@yandex.ru, або «Skype»: pan_mickolaj.***

SEX-БАЛЯСЫ

# НУ НЕ МАЁ ГЭТА!

**«Вось што крыж жыватворны робіць!» Памятаеце гэтую фразу цара Іаана Грознага з вядомай савецкай кінакамедыі «Іван Васільевіч мяняе прафесію»? Калі той перахрысціў дзверы ліфта, і тыя ў гэты момант якраз адчыніліся? Вось і я апошнім часам яе паўтараю, пачуўшы адну навіну. Нябёсы прыслухаліся да мяне, ды, упэўнены, не толькі да мяне аднаго. Якая навіна? Што субкультура хіпстараў, хутчэй за ўсё, душою загавее. Калі хто са старэйшага пакалення не ў курсе, хто гэта такія, коратка нагадаю. Хіпстары — маладыя людзі са сваім мысленнем, культурай, модай. Знешняй праявай хіпстарства з'яўляюцца, калі гаварыць пра хлопцаў, вузкія штонікі, сумкі, што вельмі падобныя на жаночыя, кеды і бароды. І, напэўна, менавіта гэта адыграла сваю ролю: страціўшы першапачатковую крэатыўнасць, субкультура ператварылася ў пародыю на саму сябе. Прагназуецца, што ўжо сёлета пік папулярнасці барадатасці ў спалучэнні з вузкімі джынсамі пройдзе.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Я ўжо згадваў неяк мімаходзь, што асабіста для мяне гэта неспалучальныя рэчы — такія штонікі, падобныя на трыко, і барада. Як гаварыў Давід Гоцман з «Ліквідацыі», даведаўшыся ад гандляркі пра цану семак, «гэта балюча!». Або штаны нармальныя нацягні, або твар пагалі! Будзь мужыком, а не саладжавым хлопчыкам! Бо ў дадатак да такога «прыкіду» многія сённяшнія (назавём іх маладымі людзьмі) яшчэ і менталітэт маюць нейкі дзявочы. Анекдот чулі? Два бацькі размаўляюць. «Чуў, у цябе дзіця нарадзілася. Віншую. Як назвалі?» — «Коля» — «Прыгожае імя» — «Згодны. Толькі намучыцца з ім дзеўка...».

Дарэчы, апошнім, на дзіва, такія паводзіны маладых людзей падабаюцца. Дык гэта зараз, а пасля што будзе? («Кожная дзяўчынка жадае выйсці замуж за прынца. А потым здзіўляецца, чаму той ляжыць на канапе, а не «паша», як селянін або рабочы». Ці вось яшчэ з той жа серыі. Хлопчык пытаецца ў бацькі, хто такі мужчына. «Ну... Гэта моцны чалавек, які любіць, ахоўвае сваю сям'ю і клапоціцца пра яе». — «Выдатна! Хачу быць мужчынам! Як наша маці!»).

Чую папрокі: маўляў, чаго накінуўся так на бедных маладых людзей? Як казаў некалі ўдзельнік «зорнай» каманды КВЗ БДУ (у вобразе «галоўнага» цыгана Савецкага Саюза Будулая), звяртаючыся да Гусмана ў журы: «Дабрэйшым трэба быць, мілы чалавек, дабрэйшым!» А вось дудкі! Як прамалінейна абазначыў сваю пазіцыю капітан Жаглоў, так і я скажу: «Дзірку вы ад абаранка атрымаеце, а не Шарапава!» У тым сэнсе, што я сваіх перакананняў не змяню. Бо справа ж, як вы разумееце, не толькі ў «прыкідзе». Як той казаў, і мы калісьці былі рысакамі. Насілі скураныя курткі, адпускалі вусы і тыя ж бароды — словам, як маглі, падкрэслівалі менавіта сваю прыналежнасць да мужчынскага полу. А зараз усё з нейкім дзіўным ухілам: танклявы хлопчык з доўгімі валасамі і падабенствам барады на тваіх вачах у метра, адстаўляючы пальчыкі з доўгімі адпаліраванымі пазногцямі, гартае дадаткі на айфоне... Вы бачылі мініяцюру каманды КВЗ з Краснаярска «Маладосць» пад назвай «Водпуск у Тайландзе»? Там «звычайны сібірскі мужычок» звяртаецца да двух дзяўчат-азіятак: «Мужыкі, ды вы што? Вы што, мужыкі, сур'ёзна? Сарамата якая... Я чуў, што ў Тайландзе беспарадкі, але каб такое... Разам жа прыляцелі... Сямёныч, Пятровіч!..».

**Як прамалінейна абазначыў сваю пазіцыю капітан Жаглоў, так і я скажу: «Дзірку вы ад абаранка атрымаеце, а не Шарапава!» У тым сэнсе, што я сваіх перакананняў не змяню.**

Напрыклад, вы можаце сабе ўявіць колішняга дэсантніка, які 2 жніўня прыйшоў на сустрэчу з таварышамі па службе ў такім «прыкідзе» — у вузкіх штонікак, кедах, прыталеным пінжачку, з-пад якога праглядае «цельнік»?.. Вось і я не магу. Затое бачыў, як да цешчы заходзіў сусед у госці — у халаце для лазні і з сетачкай для валасоў на галаве (памятаеце, у Казадоева з «Брыльянтавай рукі» такая была?). Вас нічога не бянтэжыць? Вось і яго — не. Таму што ў свой час не патлумачылі... Раней як казалі? «Сягоння ён іграе джаз, а заўтра радзіму прадасць». Іншы сусед выходзіць на вуліцу браму адчыняць таксама ў белым халаце для лазні пад чорныя шкарпэткі... Эх, правільна раней гаварылі... А што тыя ж шкарпэткі выкарыстоўвае яшчэ і пад летнія басаножкі (у самім жа слове падказка!) далёка не адзін прадстаўнік моцнай паловы... Зноў жа, анекдот. Сын скардзіцца маці: «Мяне ў двары усе дражняць!» — «А ты не звяртай увагі! Запраўляй світарок у штонікі, штонікі ў шкарпэткі і ідзі — гуляй!» Так што даруйце яшчэ раз, але, як гаварыў Астап Бендэр: «Ідзіце, ідзіце, я падаЮ толькі па суботах».

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што пра хіпстараў ведаюць пераважна жыхары вялікіх гарадоў. У вёсцы яны — «птушкі» рэдкія і, як правіла, залётныя. Мне спадабалася некалькі каментарыяў з сеціва на навіну, што хіпстарства знікае. «А што, гэта было модна?» і «Як часам добра жыць у правінцыі!» Кшталту як у камедыйным серыяле «Кухня» атрымалася. Памятаеце эпізод, калі шэф-повар рэстарана (акцёр Дзмітрый Назараў) звяртаецца да гаспадара (акцёра Дзмітрыя Нагіева, які іграе ў фільме Дзмітрыя Нагіева): «Там нашага бамжа крыўдзяць!» А той перапытвае са здзіўленнем: «У нас ёсць свая бамжА?» Таму скончыць хацелася б словамі нашага земляка Андрэя Скарахода, сказанымі падчас выступлення за смаленскую каманду КВЗ «Трыёд і дыёд», калі яго герой прыходзіць рэгістравацца ў якасці кандыдата ў прэзідэнты. «Ваша апошнее месца працы?» — пытаюцца ў яго. «Бойня жывёл». — «А чаму вырашылі змяніць яго?» — «Ну не мае гэта!».

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Мне дастаткова і Еўропы»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Прысутныя, між іншым, цікавяцца: ці магчыма падчас такіх кастынгаў у некага закахацца?*

— Не (*усміхаецца*). Мне 28, і ў такім узросце ўжо не закахаешся. Але падчас працы на праекце буду імкнуцца менш кантактаваць з дзяўчатамі, каб такога дакладна не адбылося. Ведаеце, самае крыўднае, мабыць, калі табе тэлефануе прадзюсар і кажа: «Кастынг ты не прайшла, але давай паабедаем разам». Таму я трымаюся ад такіх сітуацый убаку.



**«Лепш я буду менш папулярным з той музыкай, якая падабаецца мне, чым атрымаю славу ад песень, якія мне не падабаюцца».**

***— Саша, а дзе вы зараз жывяце? Бабулю ўжо наведалі?***

— Жыву ў атэлі. А калі да бабулі ў госці заязджаю, то яна мне вельмі смачныя калдуны гатуе. Як родзічы разам збіраюцца, кожны хоча паведаміць мне знаёмую гісторыю — ужо ўсё ведаю пра сваё дзяцінства з тых аповедаў. Мая сям'я, безумоўна, радуецца, калі я знаходжу час для іх. Але больш родных і радуе, і супакойвае, калі мы бачымся рэдка, бо гэта сведчанне, што мая кар'ера ўдала складваецца. Мая мама вельмі хвалявалася б, калі б я жыў у яе доўга.

***— Ці прыслухоўваецеся да меркавання родных наконт творчасці?***

— У гэтым плане ў мяне свабода дзеянняў. Адзінае, што адна з маіх бабуль неяк заўважыла, што глупства я спяваю ў «Fairytale», быццам, на мне праклён. Ніхто пра гэта раней не задумваўся.

*Саша зазначае, што кожны раз, калі бывае ў Расіі ці ў Беларусі, сустракаецца не толькі з бабулямі Зінай і Маяй, але таксама стараецца знаходзіць час для сяброў і любімай пляменніцы Ульяшы. Расказвае і пра тое, што бабуля спрабуе знаёміць яго з дзяўчатамі, але пра ўнукаў не пытае...*

— У нашым свеце пайсці на спатканне — не значыць заўтра ажаніцца. Калі я сустракаюся з дзяўчынай, каб пафліртаваць, то адразу кажу ёй, што не варта нічога ад мяне чакаць і на нешта спадзявацца. А калі казаць пра пастаянныя адносіны, то, як па мне, будзе вельмі эгаістычна з майго боку, каб яна мяне чакала месяцамі, пакуль я езджу па ўсім свеце з канцэртамі. Пра сям'ю буду думаць, калі стану больш вядомым кампазітарам. Сёння я яшчэ здольны канкурыраваць з маладымі і новымі артыстамі ў Скандынавіі, у Расіі, бо адчуваю сябе юным. А ў сорак мне ўжо наўрад ці захочацца пастаянна займацца на трэнажорах толькі для таго, каб змагацца з некім... Я хацеў бы падтрымліваць маладыя таленты.

**«У нашым свеце пайсці на спатканне — не значыць заўтра ажаніцца. Калі я сустракаюся з дзяўчынай, каб пафліртаваць, то адразу кажу ёй, што не варта нічога ад мяне чакаць і на нешта спадзявацца».**

*Дарэчы, ідэю знайсці ў нашай краіне таленавітых дзяцей, якія іграюць у аркестрах, пазаймацца з імі, а потым выступіць разам на канцэрце, Аляксандр абмяркоўваў летам нават з міністрам культуры, аднак навін па гэтай тэме не чуваць. Спявак мае вопыт такога супрацоўніцтва ў многіх краінах, а ў нас ініцыятыва пакуль не прабіла сабе дарогі...*

— У Беларусі мне даюць пакуль адзін адказ: калі рабіць такі праект з Рыбаком, то хацелася б і зарабіць, а не арганізоўваць усё толькі дзеля дзяцей. Сам я не прашу высокіх ганарараў. І мяне вельмі засмучае, што на маёй радзіме такое стаўленне да падобных праектаў. Спадзяюся, знойдзецца дырэктар, які пачне «новую хвалю» і гэтую тактыку падтрымаюць.

***— А ў Беларусі адчуваеце сваю папулярнасць?***

— На вуліцы мяне пазнаюць у любой краіне аднолькава. Але мне пашчасціла: ёсць краіны, дзе не глядзелі «Еўрабачанне», і там мяне ведаюць не як пераможцу гэтага конкурсу, а таму, што знаёмыя з маёй творчасцю ў інтэрнэце. Мяне, напрыклад, хочуць «раскруціць» у Амерыцы. Але, скажыце, які рускі артыст не быў там і не спрабаваў стаць вядомым? Я гляджу на такія сітуацыі прыземлена, бо мне гэта не трэба. Мне дастаткова і Еўропы... У Беларусі і на карпаратывы клічуць выступаць, але з-за шчыльнага графіка, на жаль, часта адмаўляюся. Бо тады даводзілася б адмяняць іншыя важныя канцэрты і тэлешоу...

***— Ці змяніўся ваш погляд на паспяховасць за час, што прайшоў пасля трыумфу на «Еўрабачанні»?***

**«Я напісаў песню з фальклорным ухілам. Яна будзе называцца «Акцэнт». На «Еўрабачанні» мне хацелася б паказаць сапраўдную Беларусь — цыплую, чыстую і абаяльную, як яе дзяўчаты».**

— Для мяне вельмі важны ўнутраны поспех. Лепш я буду менш папулярным з той музыкай, якая падабаецца мне, чым атрымаю славу ад песень, якія мне не падабаюцца. Бывае, у мяне пытаюць, чаму я больш не пішу кампазіцый для радыёфармату. Тут усё проста: мне не цікава гэтым займацца. Так, я эксперыментаваў з «Еўрабачаннем», і часам пішу попмузыку. Але тады я думаю не пра радыёэфір, а пра прыхільнікаў, якіх, напрыклад, у тым жа «Фэйсбуку» ў мяне 750 тысяч. І яны будуць сачыць за маёй творчасцю і без ратацый на радыё. Наогул YouTube — мой галоўны радыёканал. Гэта тое ж самае, калі б журналіст паважанага выдання звольніўся з працы і пачаў весці блог, таму што там чытачоў больш. Такая логіка мне не падабаецца, таму і музыку я раблю такую, каб перш за ўсё яна падабалася мне самому.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар-галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.259.
Нумар падпісаны ў 19.30 22.10.2014 г.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

Открытое акционерное общество
## «Белорусский народный банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2014 г.

ОАО «БНБ-Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2014 | 01.10.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 118 905 | 86 510 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 563 530 | 402 265 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 136 723 | 45 179 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 262 512 | 990 516 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 12 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 78 | 78 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 120 850 | 86 346 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 4 819 | 2 986 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 27 080 | 18 276 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 2 234 509 | 1 632 156 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 103 128 | 101 950 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 395 615 | 454 356 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 1 173 883 | 688 294 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 34 052 | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 148 678 | 119 726 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 20 980 | 13 544 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 876 336 | 1 377 870 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 69 220 | 69 220 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 44 277 | 44 277 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 97 715 | 81 516 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 146 961 | 59 273 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 358 173 | 254 286 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 2 234 509 | 1 632 156 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2014 г.

ОАО «БНБ-Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2014 | 01.10.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 159 946 | 103 333 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 70 916 | 38 516 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 89 030 | 64 817 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 50 868 | 31 900 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 10 384 | 5 911 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 40 484 | 25 989 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 47 804 | 27 030 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (24 504) | (10 112) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7 981 | 12 520 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 18 258 | 848 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 80 642 | 52 499 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4 980 | 2 954 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 77 469 | 40 599 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 14 335 | 7 631 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 63 134 | 32 968 |

**Заместитель генерального директора** **С.К. Сабук**

**Главный бухгалтер** **Н.П. Шнип**

**Дата подписания «20» октября 2014 г.**

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
**http://www.bnb.by/o-banke/finansovye-pokazateli/finansovaya-otchetnostj/otchet-o-pribyli-i-ubytkakh.html**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 07 июня 2013 г. УНП 100513485.

## Звярні ўвагу

# СУПРАЦЬ СТРЭСАЎ І ДЭПРЭСІІ. І не толькі...

**Чатыры дні, з 21 па 24 кастрычніка, праходзіць у Мінску 22-я міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Медыцына і здароўе — 2014»**



**Таццяна Ціхан знаёміць з апаратам, які дазваляе змагацца з цэлюлітам і спрыяе амаладжэнню твару.**



**Сяргей Цісленка займаецца хадзьбой на імітатары «Імітрон», які дае нагам досыць эфектыўную нагрузку.**



**Наталля Трухан *(злева)* і Вікторыя Беразоўская правяраюць работу масажных крэслаў.**

Фота Наталлі АСМОЛЫ.

Размешчаная ў Футбольным манежы «МінскЭкспа», яна прыцягвае ўвагу тысяч мінчан і гасцей сталіцы. Медыцынская тэхніка, абсталяванне, розныя матэрыялы і сродкі для лячэння, стацыянарныя і лячэбныя лабараторыі, дыягнастычныя цэнтры, медыка-генетычныя клінікі — з усім гэтым можна пазнаёміцца на выстаўцы. Шмат што з абсталявання, трэнажораў дапамагае змагацца са стрэсамі, здымае напружанне, павялічвае працаздольнасць, дапамагае спакойна пераносіць цяжар фізічных нагрузак.

У межах выстаўкі фактычна рэалізоўваюцца два азнаямленчыя праекты — «Медыцына» і «Здароўе». Асаблівай увагай шараговых наведвальнікаў карыстаюцца апараты і сродкі для карэкцыі фігуры. Можна ўсё паспрабаваць на сабе, не толькі атрымаць ад гэтага задавальненне, але і задумацца, што ж патрэбна набыць ці якімі медыцынскімі, аздараўленчымі паслугамі варта скарыстацца ў блізкай будучыні. Зразумела, увагу прыцягвае дэкаратыўная і лячэбная касметыка. Яна прадстаўлена на любыя густы. Асобна працуюць міжнародныя спецыялізаваныя салоны «Здаровае харчаванне», «Спорт і здароўе», «Медыцынскі і аздараўленчы турызм». У межах прадстаўлення апошняга з іх можна адкрыць шмат цікавага пра лячэнне ў Беларусі і за яе межамі, даведацца пра турызм для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. А яшчэ — адкрыць для сябе новыя тэхналогіі ў курорталогіі і фізіятэрапіі. Як у нашай краіне, так і ў блізкім і далёкім замежжы.

**Сяргей ШЫЧКО**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 12 НОЯБРЯ 2014 ГОДА ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ ЕДИНЫМ КОМПЛЕКСОМ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО НА ПРАВЕ ХОЗЯЙСТВЕННОГО ВЕДЕНИЯ УНИТАРНОМУ ПРЕДПРИЯТИЮ «АГРОМАЗ»

| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе, входящем в состав предмета торгов)** |
|---|
| Капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 611/С-27834 общей площадью 1034,4 кв. м, с составными частями и принадлежностями согласно техническому паспорту, составленному по состоянию на 25.04.2011 (наименование — Мясоперерабатывающий комплекс); труба дымовая (инв. № 2032601); ванна для мойки (инв. № 4290301); оборудование МПЦ (инв. № 4510500); волчек МП-160 (б/у) (инв. № 4573811); термодымокамера УК-3/2 (инв. № 4510501); водяная баня WB-11 (инв. № 4510502); пила ленточная (инв. № 6003915); стиральная машина АРДО (инв. № 4508388); весы для взвешивания скота (инв. № 4703902); весы товарные ВТ-4014–500 Ш (инв. № 4703900); весы электронные ТВ-S-200, 2-А-1 (инв. № 4700101); трихенилloскоп ПТ-80 (инв. № 4520001); электрофотометр SH-830 (инв. № 4736001); эстакада (приспособление для погрузки и выгрузки скота) (инв. № 2035701); вешала для голов (инв. № 7017000); тележка для кож (инв. № 4573812); установка вакуумная для массирования мяса УВМ-400 (инв. № 4580300); весы лабор. (инв. № 4700102); весы электронные лабораторн. ВК-600 (инв. № 4700103); инъектор AN 20 (инв. № 4510201); тележка ручная (инв. № 4573810); принтер этикеток Х-2000V (инв. № 48000311); аквадистилятор электрический ДЭ-ТЗМОИ (инв. № 4601000); тележка ручная (инв. № 4573811); пеногенератор (инв. № 4510200); площадка для сбора костей (инв. № 4510203); экран для потока воздуха (инв. № 4510202); весы с печат. этикеток (инв. № 47070003); контейнер для отходов МПЦ (инв. № 7000011); шкаф для посуды (мебель) (инв. № 258); шкаф вытяжной металлический (инв. № 4519001); стеллаж в морозильную камеру (3 шт., инв. №№ 7001013, 7001014, 7001015); стеллаж для хранения моющих дезинф. средств (2 шт., инв. № 7001016, 7001018); стеллаж для хранения моющих и дезинф. средств (инв. № 7001017); стеллаж для хранения внутрицеховой тары (2 шт., инв. №№ 7001019, 7001020); подставка для мойки фортухов с подводом воды (2 шт., инв. №№ 7001021, 7001022); шкаф сушильный ШС-80 (инв. № 7002001); контейнер малый комбинированный (4 шт., инв. №№ 7000010, 7000011, 7000012, 7000013); стеллаж для тары (2 шт., инв. №№ 7001011, 7001012); стеллаж в камеру посола (5 шт., инв. №№ 7001023, 7001024, 7001025, 7001026, 7001027); подставка для сушки обуви (2 шт., инв. №№ 7001036, 7001037); стеллаж для охлаждения (6 шт., инв. №№ 7001028, 7001029, 7001030, 7001031, 7001032, 7001033); стеллаж для субпродуктов (инв. № 7001034); стеллаж для посола и хранения кишечного сырья (инв. № 7001035); стеллаж для охлаждения (инв. № 7001038); оборудование для МПЦ (инв. № 45105001); автоматический сигнализатор паров аммиака (инв. № 4402754); прибор КСМ 2–076, 2 тон (инв. № 4402753); комплект льдогенератора GB 1540 (инв. № 4510200); холодильное оборудование (инв. № 4506254). |
| Площадь земельного участка — 1,4664 га, кадастровый номер 620400000001000727 |
| Местонахождение — Минская область, Березинский район, д. Василевщина |
| Начальная цена — 3 970 873 514 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка — 390 000 000 белорусских рублей |

**Продавец имущества** — унитарное предприятие «АгроМАЗ», 223311, Республика Беларусь, Минская область, Березинский район, д. Василевщина.

**Организатор торгов** — УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов** — победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «АгроМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС–Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

